Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№ 78 (28442)
26 КРАСАВІКА 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



**Шлагбаум вырашыць праблему парковак?** МС



**Прыступкі жыцця «Жанчыны года»** МС



**Што такое несапраўдныя шлюбы**
СТАР. 15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Раіса СІДАРЭНКА, намеснік міністра адукацыі:**

*«У найбліжэйшы час мы накіруем лісты ва ўстановы адукацыі з рэкамендацыямі ўзмацніць кантроль за правільным вызначэннем аб'ёмаў дамашніх заданняў для вучняў. Калі кожны настаўнік будзе ўлічваць, што дзіця выконвае не толькі заданне па яго прадмеце, а яшчэ па некалькіх іншых, то перагрузкі вучня адбывацца не будуць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8763 | ▼ |
| Еўра | 2,0122 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0695 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Раданіца ў Жорнаўцы



**Вёска Жорнаўка знаходзіцца ў Бярэзінскім раёне. На мясцовых могілках ёсць свае адметныя асаблівасці. Напрыклад, на Радаўніцу (так тут называюць Радаўніцу) па даўнейшай традыцыі магілы засцілаюць абрусамі, на іх ставяць ежу — для Дзядоў — бо гэта іх Вялікдзень. Прынамсі, каб убачыць гэту традыцыю, я і наведаў учора Жорнаўку. На жаль, традыцыя становіцца ўжо рэдкай. Але на могілках у Жорнаўцы я ўбачыў тое, чаго ніколі не мог уявіць: некаторыя надмагільныя помнікі — сапраўдныя жорны з млына. Месцічы расказалі, што ў вёсцы сапраўды быў вадзяны млын (у вайну яго ўзарвалі), а гаспадароў млына хавалі на гэтых могілках, выбіваючы прозвішчы і імёны на жорнах. На адных пазначана дата — 1887 год...**

**Няма ўжо ў вёсцы млына, сышлі ў нябыт млынары і іх сваякі. А вяскоўцы і сёння даглядаюць помнікі-жорны, не даючы ім зраўняцца з зямлёй...**

**81-гадовая Марыя БУКАТАЯ (на фота), якую я сустрэў на могілках, заўсёды наведвае гэтыя адмысловыя помнікі.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

■ Узровень

# ВЯЛІКІ ФІНАЛ. ЧАКАЕМ!

## Жаночая тэнісная зборная ўпершыню ў гісторыі будзе змагацца за перамогу ў Кубку Федэрацыі

**Аляксандра Сасновіч, Арына Сабаленка, Вера Лапко і Вольга Гаварцова вялікімі літарамі ўпісалі свае імёны ў гісторыю беларускага тэніса. На неафіцыйным камандным чэмпіянаце свету яны зрабілі практычна немагчымае — прабіліся ў фінал прэстыжнага турніру, пакінуўшы за сабой зборныя Канады, Расіі, Галандыі і Швейцарыі.**



Фота БЕЛТА.

«Мы ў фінале» — менавіта такія словы марылі пачуць тысячы беларусаў, якія сачылі за выступленнем нашых дзяўчат у мінулыя выхадныя на кортах «Чыжоўка-Арэны». Паўфінал FedCup усе чакалі з невялікім хваляваннем, бо супраць нашай маладой, але дзёрзкай дружыны на корты выходзілі больш вопытныя, кіруемыя бліскучай тэнісісткай сучаснасці — Марцінай Хінгіс — швейцаркі. Пасля першага дня, калі Аляксандра Сасновіч здабыла стартавую перамогу, а Арына Сабаленка пацярпела паражэнне, хваляванне адышло, наша каманда зразумела, што і гэтым разам можа змагацца з моцным сапернікам. Усё вырашылася ў другі дзень матча, калі ўсё тыя ж дзяўчаты ўжо цвёрдай рукой здабылі перамогу для ўсёй краіны.

СТАР. 3

■ Энергетычная бяспека

# БЕЛАЭС: ТУТ ДЗЕЙНІЧАЕ РЭЖЫМ ПАСТАЯННАГА НАГЛЯДУ

## По тэхнічных аспектах да беларускага боку пытанняў не засталося



**Нядаўна завяршылася 7-я нарада дагаворных бакоў Канвенцыі аб ядзернай бяспецы. У штаб-кватэры МАГАТЭ ў Вене беларуская дэлегацыя абараняла нацыянальны даклад перад міжнароднымі структурамі. Аб выніках гэтага мерапрыемства расказалі члены дэлегацыі ўпрэс-цэнтры БЕЛТА.**

### Адказвалі максімальна разгорнута

Задоўга да нарады дагаворных бакоў беларускі даклад выклікаў павышаную цікавасць, супастаўную з цікавасцю да дакладаў краін з развітой ядзернай энергетыкай, паведаміў кіраўнік нашай дэлегацыі **першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Васіль СЦЕПАНЕНКА.** Да даклада паступіла 214 пытанняў (ад Літвы — 73). Літоўскі бок быў самым «уедлівым», бо цікавілі яго самыя розныя аспекты будаўніцтва Беларускай АЭС, якія датычыліся выбару пляцоўкі станцыі, арганізацыі нагляду, аварыйнага рэагавання і іншых момантаў.

Нашай краінай на ўсе пытанні былі дадзены аб'ёмныя і вычарпальныя адказы, паколькі ніякіх заўваг адносна таго, што мы на нешта не адказалі, не паступіла. «Пытанні былі сфармуляваны коратка, а мы пастараліся адказаць на іх разгорнута, каб не ўзнікала ніякіх непаразуменняў», — адзначыла **начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляда) Вольга ЛУГАЎСКАЯ.** Фармат абароны на пляцоўцы МАГАТЭ дазваляў задаваць дадатковыя пытанні па нацыянальным дакладзе.

СТАР. 3

## Прэзідэнты Беларусі і Украіны наведаюць Чарнобыльскую АЭС

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сёння прыме ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных чарговай гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам наведаюць атамную станцыю і размешчаныя побач з ёй аб'екты. Асноўная ўвага будзе ўдзелена работам, якія праводзяцца для падтрымання на належным узроўні радыяцыйнай бяспекі, што непасрэдным чынам закранае інтарэсы жыхароў абедзвюх краін. Плануецца, што прэзідэнты азнаёмяцца з будаўніцтвам новага бяспечнага ахоўнага збудавання і з захоўваннем адпрацаванага ядзернага паліва, ушануюць памяць ліквідатараў і пацярпелых у выніку аварыі.

У гэты ж дзень Аляксандр Лукашэнка і Пётр Парашэнка правядуць перагаворы на тэрыторыі Беларусі. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць шырокі комплекс пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай сферы, а таксама пытанні палітычнага ўзаемадзеяння, міжнародны парадак дня і далейшыя намаганні па мірным урэгуляванні канфлікту на паўднёвым усходзе Украіны.

## ДОМ ДЛЯ ПРЫГОЖАГА СПОРТУ

**У хуткім часе на праспекце Пераможцаў з'явіцца новы будынак. Тыя, хто працаваў над яго будаўніцтвам падчас рэспубліканскага суботніка, ўпэўнены: Цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы стане сапраўдным упрыгажэннем адной з ключавых магістраляў сталіцы. Менавіта на гэтым аб'екце працаваў падчас суботніка Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**



З самай раніцы на месцы будаўніцтва гэтага аб'екта было людна, але без мітусні: рабочыя займаліся сваёй звычайнай штодзённай працай, удзельнікі суботніка рыхтаваліся падключыцца да іх. А з прыбыццём кіраўніка дзяржавы работа закіпела.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якім будзе новы спартыўны цэнтр, і падкрэсліў: не павінна быць ніякіх лішніх элементаў. Тут павінны рыхтавацца будучыя чэмпіёны, адпаведна, галоўнае прызначэнне будынка — чыста ўтылітарнае. Галоўнае, каб ён быў зручны для саміх гімнастаў, трэнераў.

Дарэчы, спартсмены прынялі ўдзел у праектаванні Цэнтра: яны выказвалі свае прапановы, дзе і што павінна размяшчацца. Абавязковае патрабаванне гімнастак: высокія столі — гэта вельмі важна для адпрацоўкі многіх практыкаванняў.

Брыгада нумар адзін Прэзідэнта занялася выкананнем работ па ўкладцы падлогі на першым паверсе аб'екта. Гэта прыём і ўкладка бетоннай сумесі бетонапомпай, ушчыльненне бетоннай сумесі глыбінным вібратарам, разраўноўванне бетоннай сумесі і загладжванне адкрытых паверхняў.

Дырэктар Упраўлення капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама Дзмітрый Мікулёнак расказаў журналістам пра новы Цэнтр. Па яго словах, цяпер ён разам з інжынернымі сеткамі ацэньваецца ў эквіваленце ў 30 мільёнаў долараў. Аб'ект будзе адпавядаць усім патрабаванням Федэрацыі па мастацкай гімнастыцы. Па словах дырэктара УКБ Мінгарвыканкама, гэта значыць, ён будзе забяспечваць увесь цыкл трэніроўкі нашай алімпійскай каманды. Аб'ект цалкам уключае ў сябе ўсе блокі, неабходныя для здзяйснення трэніровачнага працэсу. Алена Скрыпель, старшыня Беларускай асацыяцыі гімнастыкі, адзначыла, што вялікае значэнне надаецца прастору, вільнаму планаванню прасторы. Самае галоўнае, упэўнена яна, каб не было лішніх калідораў, лішніх памяшканняў.

Ксенія Санковіч, бронзавая прызёрка Пекінскай Алімпіяды, сярэбраная — Лонданскай, якая таксама прыйшла папрацаваць на суботніку, расказала, што падобнага Цэнтра вельмі не хапае. Гімнасткі цяпер займаюцца ў перапоўненых залах, бо ахвотных, асабліва апошнім часам, шмат. Спартсменка выказала спадзяванне, што гімнасты, якія стануць займацца ў новым Цэнтры, прынясуць краіне шмат новых узнагарод.

* * *

Падчас суботніка супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта добраўпарадкавалі стадыён «Дынама» — знакавы для нашай краіны аб'ект, калі ўлічыць, што праз некалькі гадоў у Беларусі адбудуцца II Еўрапейскія гульні. Наталля Качанава, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, звярнула ўвагу, што той аб'ём работ, які змаглі зрабіць за час суботніка работнікі ўстановы, з'яўляецца зусім невялікім на фоне маштабаў усіх будаўніча-мантажных мерапрыемстваў, якія запланаваны на «Дынама» за час рэканструкцыі. «Але разам з тым, калі ты папрацаваў нават адзін дзень, зрабіў у гэтую справу нейкі ўнёсак, вядома, кожны раз будзеш з гонарам успамінаць, што часцінка тваёй працы, няхай і маленькая, ёсць тут, у гэтым аб'екце, які будзе радаваць мінчан і гасцей нашага горада», — сказала яна.

Супрацоўнікі Савета Міністраў, наадварот, накіраваліся далей ад гарадской будоўлі, бліжэй да прыроды. Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў удзельнічаў у пасадцы лесу на тэрыторыі Драчкаўскага лясніцтва Смалявіцкага лягсаса ў Мінскай вобласці. Тут жа працавалі першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі і віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы, работнікі Апарату Савета Міністраў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

## НАПЕРАДЗЕ ЦІКАВЫ ПЕРЫЯД

**Ергалі БУЛЕГЕНАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі:**



— Думаю, у нашых дзяржаў наперадзе вельмі цікавы перыяд. Тым больш, тэндэнцыі да пад'ёму эканомікі ўжо ёсць. У гэтым кірунку мы ўсе і працуем. Нядаўна тут была салідная дэлегацыя з Паўладарскай вобласці Казахстана, якая наведала некаторыя беларускія вобласці... Думаю, і дэлегацыі рэгіёнаў Беларусі паедуць у Казахстан. Будзем умацоўваць нашы сувязі.

Са стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза прайшло няшмат часу. Па гістарычных мерках — вельмі мала. Тым не менш гэты саюз ужо пачынае паказваць свой твар. Ёсць яшчэ шэраг нявырашаных пытанняў, пра гэта Аляксандр Рыгоравіч шмат гаворыць.

Як вядома, у тых дакументах, якія закладзены ў ЕАЭС, многія пытанні павінны быць вырашаны да 2025 года менавіта ў тых сферах, у якіх і Беларусь, і Казахстан вельмі зацікаўлены. Гэта нафта, газ... Ужо зараз пачынаюць падрыхтоўку адпаведных дакументаў. І гэта сапраўды будзе добрым стымулам для далейшага супрацоўніцтва ў Еўразійскім эканамічным саюзе. І ён стане прывабным для многіх-многіх дзяржаў. Думаю, пашырэнне ЕАЭС будзе ў наступныя гады, бо вельмі прывабны рынак нашага саюза, бо Беларусь, Казахстан, Расія — магутныя дзяржавы. Мы самі паміж сабой можам добра супрацоўнічаць.

**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**



— У краіне разгорнута вялікая работа па працаўладкаванні грамадзян. Трэба сказаць, што сёння тых грамадзян, якія непасрэдна звярнуліся ў службу занятасці і сталі на ўлік там у якасці беспрацоўных, на першае красавіка іх 43 тысячы — на 44 тысячы вакансій. На адну вакансію — адзін беспрацоўны. Гэта значыць, дастаткова добрая сітуацыя. Разам з тым ёсць праблемы. Калі па вакансіях у нас 56% — гэта рабочыя спецыяльнасці, а тых, хто стаў на ўлік службы занятасці — 76% з рабочымі спецыяльнасцямі. Дысбаланс па попыце і прапанове стварае пэўную напружаную сітуацыю на рынку працы.

Адна з найважнейшых задач для міністэрства — гэта дасягненне да канца года, да снежня, зарплаты не менш чым 1000 рублёў. І сёння ўрад, органы дзяржаўнага кіравання актыўна працуюць у гэтым кірунку. Мы бачым вынікі першага квартала: рэальны тэмп зарплаты — 101%. Ёсць пакрокавы рух наперад у гэтым кірунку.

**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**



— Як звычайна, Прэзідэнт вялікую ўвагу адводзіць эканамічнаму блоку пытанняў. Вынікі першага квартала як быццам бы пазітыўныя і радуюць нас, але мне здаецца, што гэта толькі пачатак, трэба замацаваць на трэндзе станоўчага росту ВУП. Сёння сярэдняя зарплата ў нас складае 737 рублёў. Рух наперад ёсць. Мы думаем, што гэта павінна набраць пэўныя тэмпы. Мы, безумоўна, поўныя ўпэўненасці, што на 101,7% росту ВУП па годзе выйдзем.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## НАВЯЛІ ПАРАДАК ТАЛАКОЙ

### У рэспубліканскім суботніку ўзяло ўдзел больш за 3 мільёны беларусаў

**«Суботнік прайшоў арганізавана. У ім прыняла ўдзел больш за 3 мільёны нашых грамадзян. Грашовых сродкаў, папярэдне, будзе пералічана больш за 7 мільёнаў рублёў. Гэтыя лічбы большыя, чым у 2016 годзе», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль Жарко, які таксама прыняў удзел у пасадцы алеі ў Цэнтральным батанічным садзе.**

«Частка сродкаў (50%) застаецца ў распараджэнні Мінфіна, астатнія грошы — у распараджэнні аблвыканкамаў. І яны будуць накіраваныя на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы цэнтраў дзіцячай творчасці, на рэканструкцыю і аднаўленне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне суб'ектаў інавацыйнай дзейнасці, рамонт, аднаўленне і падрыхтоўку да летняга сезона аздараўленчых дзіцячых лагераў», — растлумачыў ён.

Наш карэспандэнт падтрымала традыцыю добраўпарадкавання разам з жыхарамі Мінскай вобласці. Старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра і памочнік Прэзідэнта па Мінскай вобласці Анатоль Ісачанка, а таксама члены аблвыканкама працавалі на будаўніцтве новага дзіцячага сада на 230 месцаў у горадзе Стоўбцы. Супрацоўнікі абласных службаў і арганізацый добраўпарадкавалі розныя сацыяльныя аб'екты, ваенна-гістарычныя помнікі і мемарыяльныя комплексы, тэрыторыю Кітайска-беларускага парка «Вялікі камень».

Маштабна суботнік прайшоў і ў Брэсцкай вобласці. Асноўныя намаганні ўдзельнікаў былі сканцэнтраваны на добраўпарадкаванні тэрыторый і навядзенні парадку на зямлі. Па словах старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля Ліса, суботнік для жыхароў вобласці справа не аднаго дня. «Суботнік жа не толькі сёння праходзіць — у нас дэкада ідзе», — удакладніў ён. Так, працоўны дэсант на чале з кіраўніком вобласці ў суботу працаваў на будаўніцтве другой чаргі транспартнай развязкі «Заходні абыход Брэста». Пуцеправод даўжынёй у 2,5 км у перспектыве звяжа пагранпераходы «Варшаўскі мост» і «Казловічы».

Плануецца, што зробленыя падчас працоўнай акцыі сродкі будуць накіраваны на добраўпарадкаванне памятных месцаў, падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона. Частка сродкаў пойдзе на будаўніцтва маладзёжнага патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці і выраб скульптур да тысячагоддзя Брэста.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Эмануэль Макрон і Марын Ле Пен пачалі фінальную бітву



Як вядома, Эмануэль Макрон па выніках нядзельных выбараў прэзідэнта Францыі набраў 23,75% галасоў, у Марын Ле Пен — 21,53%. Гэтыя кандыдаты прайшлі ў другі тур, які адбудзецца 7 мая.

Макрон выступае за свабодны міжнародны гандаль і Еўрапейскі саюз. А Ле Пен супраць глабалізацыі і абяцала правесці ў Францыі рэферэндум па пытанні аб выхадзе з ЕС накшталт «брэксіта». Макрон — былы банкір і экс-міністр эканомікі пры дзеючым прэзідэнце Франсуа Аландзе. Для яго гэта першая выбарчая кампанія, і ў выпадку перамогі ў другім туры Макрон стане самым маладым прэзідэнтам Францыі (яму 39 гадоў, Ле Пен — 48). Раней пра сваю падтрымку Макрона заявілі прадстаўнікі асноўных палітычных партый і кандыдаты, якія прайгралі ў першым туры. Экс-прэм'ер Францыі Фіён ад партыі «Рэспубліканцы», які набраў 19,91% галасоў, заклікаў сваіх прыхільнікаў галасаваць за Макрона ў другім туры. «Я вельмі рады, што наша палітычная сям'я змагла дамовіцца аб тым, што галоўная задача — перамагчы Марын Ле Пен, і для гэтага няма іншага рашэння, акрамя як выказацца ў падтрымку Эмануэля Макрона», — заявіў ад імя кансерватараў Жан-Франсуа Капэ.

Падтрымаў яго і кандыдат ад пакуль яшчэ кіруючай партыі сацыялістаў Бенуа Амон, які атрымаў толькі 6% галасоў. Сацыялістычная партыя вырашыла кінуць усе свае рэсурсы ў падтрымку лідара руху «Наперад». «Зварот будзе апублікаваны ў 4 мільёнах асобнікаў, сотні тысяч плакатаў будуць надрукаваныя і расклееныя па ўсёй Францыі, нашы актывісты абыдуць тысячы дамоў, правядуць сотні сходаў у наступныя два тыдні, таму што мы не можам дапусціць, каб Францыя страціла сваю душу», — падкрэсліў першы сакратар Сацыялістычнай партыі Жан-Крыстоф Камбадэліс.

Прэзідэнт Аланд выступіў па тэлебачанні і заявіў, што будзе галасаваць на маючым адбыцца другім туры прэзідэнцкіх выбараў за Макрона. Ле Пен дзеючы кіраўнік Францыі назваў пагрозай для краіны.

Відавочным фаварытам другога тура лічыцца Макрон, але Ле Пен не плануе здавацца раней часу. Свайго саперніка яна назвала «слабым перад тэрарызмам». «Я думаю, паміж двума турамі людзі зразумеюць сутнасць праекта, прапанаванага спадаром Макронам», — заўважыла Ле Пен. Яна заявіла, што адыдзе ад кіраўніцтва партыяй «Нацыянальны фронт», каб засяродзіцца на другім туры прэзідэнцкіх выбараў. «Я заўсёды лічыла, — сказала Ле Пен, — што прэзідэнт рэспублікі з'яўляецца прэзідэнтам усіх французаў. Цяпер трэба пераходзіць ад слоў да справы. Мы можам перамагчы. І мы пераможам».

Такім чынам, Эмануэль Макрон і Марын Ле Пен пачалі фінальную бітву. Хутка ім трэба будзе сысціся ў тэлядэбатах. Хто стане новым гаспадаром Елісейскага палаца, стане вядома 7 мая.

**Аршанскі раённы выканаўчы камітэт і Аршанскі раённы Савет дэпутатаў выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па бюджэце і фінансах Дабрыйнай Людміле Анатолеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю мужа дачкі.**

■ Пасля Чарнобыля

# ПАЛЕССЕ ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ

**У Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася незвычайная выстава. Фотамастак з Мазыра Уладзімір Верабей ужо не адно дзесяцігоддзе адпраўляецца ў экспедыцыі па Беларускім Палессі. У яго аб'ектыў трапілі фотазамалёўкі прыроды, якая прыняла на сябе радыяцыйны ўдар. І вёскі, якія непрыкметна дажываюць свой век. Назва ў выставы адпаведная: «Чарнобыль. Погляд з сучаснасці».**



Гледача ў выставачнай зале сустракаюць ацалелы нейкім чынам ліхтар на драўляным слупе, у якім нават захавалася лямпачка. Даўно кінутыя на берагах ракі чаўны, у якіх больш ніхто не паплыве. Дамы, у якія людзі не заходзілі дзесяцігоддзямі, і якія ўжо пачалі развальвацца. А як са струхлелай лаўкай і плотам кантрастуе галінка свежага бэзу, пакладзеная кімсьці з мясцовых жыхароў! Як напамін пра тое, што прырода ўсё ж імкнецца пераадолець радыяцыйную навалу, — куст, які працягнуў свае галінкі да сонца проста з чыйгосьці акна...

— Усе фотаздымкі зроблены на Гомельшчыне, — кажа Уладзімір Верабей. — Болей за астатніх фатаграфую прыроду і вёскі ў Нараўлянскім, Петрыкаўскім і Мазырскім раёнах. Сустракаў я і шмат самасёлаў. Яны ўсе з'ехалі назад у бацькоўскія хаты, саматужна іх рамантуюць. А якія на адселенай тэрыторыі флора і фаўна! Падчас кожнага выезду абавязкова пабачыш якую-небудзь цікавінку. І не магу ўжо без гэтага. Два-тры тыдні туды не выберашся — і чагосьці ўжо не хапае.

Гэта пятая выстава Уладзіміра Вераб'я. Дагэтуль яны праходзілі двойчы ў Гомелі, Мазыры і нават ізраільскай Хайфе. Паглядзець на драматычную, але з-за гэтага куды больш прыцягальную прыгажосць Палесся ў Мінску можна да 21 мая.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Здарэнне

# У Польшчы пацярпелі нашы турысты

**Учора раніцай непадалёк ад горада Завада, што ў Лодзінскім ваяводстве Польшчы, вылецеў у кювет і перакуліўся аўтобус з беларускімі турыстамі, паведамляюць польскія СМІ.**



Усяго ў салоне знаходзіўся 41 грамадзянін нашай краіны, яны вярталіся з вандроўкі ў Прагу. Паводле папярэдняй інфармацыі, пацярпела 18 чалавек. Усе параненыя былі дастаўлены ў шпіталі Лодзі і Варшавы, на месцы працавала восем машын хуткай дапамогі. Акрамя таго, для аказання дапамогі адной з пацярпелых, што атрымала цяжкую траўму галавы і грудной клеткі, быў выкліканы верталёт.

Як паведамляе польская паліцыя, прыкладна а чацвёртай гадзіне раніцы па мясцовым часе аўтобус маркі Eos з невядомых прычын з'ехаў на абочыну дарогі, пасля чаго зваліўся з насыпу ў роў. У выніку ДТЗ на аўтатрасе ўтварыўся затор у абодвух напрамках. Тыя пасажыры, што не пацярпелі ў здарэнні, далі паказанні супрацоўнікам паліцыі, каб высветліць прычыну інцыдэнту. Паведамляецца, што кіроўца аўтобуса не знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення.

Міністэрства замежных спраў адсочвае сітуацыю з беларускім аўтобусам, знаходзіцца ў кантакце з праваахоўнымі органамі і медыкамі. Па беларускіх грамадзян выехаў новы аўтобус з Гродна.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# БЕЛАЭС: ТУТ ДЗЕЙНІЧАЕ РЭЖЫМ ПАСТАЯННАГА НАГЛЯДУ

## Мыш не прашмыгне

Вольга Лугаўская паведаміла, што сёння на пляцоўцы Беларускай АЭС створана дзейсная сістэма нагляду. Яна нагадала, што раней на папярэдняй нарадзе дагаворных бакоў Канвенцыі аб ядзернай бяспецы адна з задач для Беларусі была сфармулявана як «арганізацыя інспекцыйнай сістэмы на пляцоўцы ўзвядзення АЭС». Тады быў пачатак узвядзення станцыі, таму пытанне стварэння адэкватнай і эфектыўнай сістэмы нагляду за выкананнем усіх відаў работ на пляцоўцы будаўніцтва было найбольш актуальным і важным на той момант», — растлумачыла яна. Сёлета ў МАГАТЭ Беларусь заявіла аб тым, што такая дзейсная сістэма нагляду на пляцоўцы будаўніцтва АЭС ужо дзейнічае. «Пасля абмеркавання на пляцоўцы Канвенцыі аб ядзернай бяспецы інфармацыі аб прагрэсе Беларусі па ўдасканаленні нагляду за будынкам АЭС дагаворныя бакі палічылі, што з гэтым выклікам наша краіна справілася», — адзначыла начальнік Дзяржатамнагляда.

Цяпер на пляцоўцы нашай станцыі функцыянуе сістэма пастаяннага нагляду за будынкам. «Гэта азначае, што 7 дзён у тыдзень 24 гадзіны ў суткі нашы інспектары могуць выконваць свае наглядныя функцыі. Гаворка ідзе не аб кругласутачнай працы, а пра магчымасці допуску да наглядных аб'ектаў і выкананні сваіх функцый», — растлумачыла Вольга Лугаўская. Акрамя інспектараў Дзяржатамнагляда ў фармаце пастаяннага нагляду на пляцоўцы працуюць пяць інспектараў будаўнічага нагляду і два інспектары прамысловага нагляду. Акрамя таго, працуюць інспектары па лініі санітарнага і экалагічнага нагляду.

## Заяўку на ліцэнзію атрымаем гэтым летам

Цяпер ідзе падрыхтоўка дакументаў, а непасрэдна заяўка на атрыманне ліцэнзіі на эксплуатацыю Беларускай АЭС будзе перададзена ў Дзяржатамнагляд летам 2017 года. Вольга Лугаўская ўдакладніла, што працэс разгляду заяўкі працаёмкі. Згодна з заканадаўствам, на разгляд пакета дакументаў адводзіцца адзін год. «У рамках гэтага працэсу рэгулюючы орган мае права патрабаваць дадатковыя матэрыялы, калі нейкія пытанні будуць недастаткова асветленыя ў пададзеных дакументах», — дадала начальнік Дзяржатамнагляда.

Працэдура ліцэнзавання ўключае ў тым ліку экспертызу справаздачы абгрунтавання бяспекі. Яна праводзіцца рэгулюючым органам з прыцягненнем спецыялістаў Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Сітуацыйныя крызісныя цэнтры створаць да запуску АЭС

**Начальнік галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны МНС Леанід ДЗЕДУЛЬ** нагадаў, што для ўмацавання патэнцыялу гатоўнасці да рэагавання на ядзерныя аварыі ў чэрвені 2016 года ўрадам зацверджана канцэпцыя сістэмы сітуацыйных крызісных цэнтраў для атамнай энергетыкі, устаноўлены планы і тэрміны мерапрыемстваў па стварэнні гэтай сістэмы. У прыватнасці, такія цэнтры будуць створаны пры Мінэнерга, Мінпрыроды, Міністэрстве аховы здароўя, МУС, Нацыянальнай акадэміі навук. Стварэнне такой сістэмы дазволіць прыцягнуць экспертаў для аказання дапамогі персаналу і кіраўніцтву АЭС па розных кірунках і мінімізаваць магчымыя наступствы ў выпадку нештатных сітуацый.

Прадстаўнік МНС нагадаў, што ў Беларусі сістэма рэагавання на ядзерныя і радыяцыйныя аварыі інтэграваная ў нацыянальную сістэму рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, якая праходзіць адаптацыю з улікам новага аб'екта — атамнай электрастанцыі.

На нарадзе дагаворных бакоў Канвенцыі аб ядзернай бяспецы, дзе разглядаўся беларускі даклад, была агучана інфармацыя, што з улікам будаўніцтва атамнай электрастанцыі былі распрацаваны праекты ўнутранага і знешняга аварыйных планаў Беларускай АЭС. Унутраны план забяспечвае абарону персаналу станцыі, а знешні — абарону насельніцтва, якое трапляе ў зону магчымага забруджвання ў радыусе атамнай электрастанцыі. «Цяпер праводзіцца іх дапрацоўка і ўзгадненне з зацікаўленымі дзяржорганамі. Плануецца практычная адпрацоўка гэтых планаў у ходзе рэспубліканскага камандна-штабнога вучэння восенню 2017 года», — адзначыў Леанід Дзедуль. Паводле яго слоў, супрацоўнікі МНС пастаянна вывучаюць практычны вопыт і рэгулярна прымаюць удзел у вучэннях за мяжой на дзеючых АЭС у Расіі, Францыі і іншых краінах.

Плануецца, што фактычна вучэнне ахопіць усю тэрыторыю краіны. «Паблізу нашых межаў знаходзяцца Смаленская, Ровенская, Ігналінская АЭС. З улікам гэтага падчас вучэнняў будзем узаемадзейнічаць з украінскім бокам, ёсць пацвярджэнне ўдзелу з боку Расіі. Калі пойдуць на кантакт, то і з літоўскім бокам будзем узаемадзейнічаць. Адпрацуем сумесныя дзеянні ў выпадку аварый у тым ліку на ядзерных аб'ектах у суседніх краінах, але галоўны акцэнт будзе на Беларускай АЭС», — дадаў Леанід Дзедуль.

«Важную ролю ў ацэнцы ступені нашай гатоўнасці да аварыйнага рэагавання будзе мець запытаная краінай у МАГАТЭ місія EPREV. Прадмісія адбылася 25—27 студзеня сёлета, а сама місія запланавана на сакавік 2018 года», — сказаў ён.

## Трэба дамаўляцца і з Літвой

А яшчэ Вольга Лугаўская паведаміла, што іх дэпартамент «не апускае рукі» і разлічвае заключыць пагадненне аб узаемадзеянні і з Дзяржаўнай інспекцыяй па атамнай бяспецы Літвы (VATESI). «Ужо з 2014 года мы спрабуем заключыць з Літвой дагавор на ўзроўні рэгулюючых органаў або ўрадавым узроўні, які б дазволіў абменьвацца інфармацыяй. Пакуль у нас не зусім гэта атрымліваецца. Але мы будзем працягваць працаваць у гэтым кірунку, — адзначыла Вольга Лугаўская. — У нас ёсць дамовы з усімі краінамі па перыметры. Вядзецца абмеркаванне з латвійскім бокам, хоць гэта краіна і не валодае ядзернымі ўстаноўкамі». Рыхтуецца аналагічнае пагадненне са Славакіяй. «Прычым усе гэтыя дагаворы заключаюцца досыць аператыўна. Прапісаныя ў іх пазіцыі нам падыходзяць як з пункту гледжання атрымання інфармацыі, так і яе прадастаўлення», — дадала яна.

Праект пагаднення з VATESI мае на ўвазе тое, што бакі маглі б узаемадзейнічаць не толькі пры нештатных сітуацыях на ядзерных аб'ектах, але і абменьвацца інфармацыяй па пытаннях рэгулявання ў гэтай сферы, распрацоўкі нарматыўнай прававой базы. «Гэта можа быць вельмі шырокі спектр пытанняў. Усё залежыць ад жадання краін, якой інфармацыяй яны хочуць дзяліцца і ў якім рэжыме працаваць», — сказала спецыяліст. Дзяржатамнагляд разлічвае на прадуктыўнае ўзаемадзеянне з літоўскім бокам і мае намер задзейнічаць для гэтага ўсе міжнародныя пляцоўкі, уключаючы МАГАТЭ. Першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Васіль Сцепаненка звярнуў увагу, што адсутнасць двухбаковага пагаднення не азначае, што бакі не будуць абменьвацца інфармацыяй. «Проста гэта будзе праходзіць у рамках МАГАТЭ. Спачатку інфармацыя будзе паступаць у МАГАТЭ, а затым і другому боку», — растлумачыў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ВЯЛІКІ ФІНАЛ. ЧАКАЕМ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

*«На вачах сваіх шматлікіх прыхільнікаў і велізарнай тэлеаўдыторыі ва ўпартай барацьбе вы паказалі яркі тэніс, высокае спартыўнае майстэрства і жалезную волю да перамогі. Гэта гістарычнае дасягненне для беларускага тэніса і адна з самых яркіх перамог айчыннага спорту, якая сведчыць аб тым, што наша краіна багатая спартыўнымі талентамі»,* — гаворыцца ў віншаванні, якое накіраваў камандзе **Прэзідэнт краіны і Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка.**

*— У тэнісе нічога не бывае проста так. У футболе — можа быць, але тэніс — гэта той від спорту, дзе заўсёды заахвочваецца старанне і руплівая праца,* — адзначыў **капітан каманды Швейцарыі Хайнц Гюнтхарт.**

*— У гэтым матчы беларуская каманда была больш храбрай, больш смелай, што і вывела яе наперад. Склалася нейкая традыцыя, што звычайна мы прайграем у паўфінале будучым пераможцам FedCup. Спадзяюся, яна захаваецца, жадаю вам перамогі ў гэтым турніры.*

На працягу ўсяго матча побач з камандай была і Вікторыя Азаранка, якая акрамя падтрымкі сваіх сябровак яшчэ і актыўна заводзіла трыбуны «Чыжоўка-Арэны». Пасля перамогі нават яна не магла стрымаць слёзы радасці.

*— Вельмі хацелася выйсці на корт і дапамагчы дзяўчатам. Я вельмі ганаруся імі. Меркавала, што, калі б справа дайшла да вырашальнай парнай сустрэчы, вынік аказаўся б не на нашу карысць. А так усё заслужана: калі меркаваць па гэтых двух днях, узровень беларусак быў вышэйшы. У фінале нам ёсць чым гуляць. Узровень гульні можна павысіць, а вось байцоўскія якасці — гэта іншая рэч, яны ў нас ёсць,* — адзначыла Вікторыя.

Дарэчы пра фінал. Да вялікай радасці і каманды, і заўзятараў ён пройдзе ў Мінску. На нашы корты прыедуць амерыканкі, якія ў паўфінале абыгралі сапернiц з Чэхіі. Менавіта зборная ЗША сёння з'яўляецца самай тытулаванай камандай планеты — яна 17 разоў станавілася ўладальнікам Кубка Федэрацыі. Для беларускіх тэністак гэта будзе першы ў гісторыі фінал неафіцыйнага каманднага чэмпіянату свету, вырашальны матч адбудзецца 11—12 лістапада.

Пакуль гісторыя сустрэч з амерыканкамі ў нас вельмі кароткая, Беларусь і ЗША гулялі толькі аднойчы, у 2012 годзе, тады саперніцы былі мацнейшыя — 5:0. Чым не нагода ўзяць рэванш? Тым больш, пакуль моц амерыканскага тэніса Серэна Уільямс толькі ідзе ў дэкрэтны адпачынак, наша Вікторыя Азаранка адтуль ужо вяртаецца.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Медыцына

# ЁСЦЬ ЧЫМ ПАДЗЯЛІЦЦА

## Абмен інфармацыяй вельмі важны ў супрацоўніцтве ў галіне аховы здароўя

**Міністры аховы здароўя Беларусі і Польшчы Валерый Малашка і Канстанцін Радзівіл падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні ў галіне аховы здароўя, медыцыны і медыцынскай навукі.**

Падчас візіту польскай дэлегацыі абмяркоўвалася і пытанне хуткага развіцця айчыннай фармацэўтыкі. Міністр аховы здароўя Беларусі Валерый Малашка пры гэтым заўважыў, што калі наладзіцца ўзаемадзеянне паміж нашымі і польскімі фармпрадпрыемствамі, можна будзе весці размову аб лекавых прэпаратах, цікавых у тым ліку для рынку Еўразійскага саюза.

У дзень падпісання мемарандума польскі міністр азнаёміўся з магчымасцямі аказання спецыялізаванай высокатэхналагічнай дапамогі ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, дзе паўтара года таму пачала працаваць унікальная не толькі для нашай, але і для шэрагу суседніх краін Рэспубліканская малекулярна-генетычная лабараторыя канцэрагенезу.

Малекулярна-генетычныя маркёры выкарыстоўваюцца ў клінічнай практыцы на ўсіх этапах аказання анкалагічнай дапамогі — у прафілактыцы, дыягностыцы і лячэнні пацыентаў з анкалагічнымі захворваннямі. Самымі значнымі сталі два кірункі прыкладных даследаванняў — дыягностыка спадчынных ракавых сіндромаў (калі той ці іншы рак перадаецца з пакалення ў пакаленне, што найбольш актуальна для новаўтварэнняў малочнай залозы, яечніка, тоўстай кішкі) і індывідуальны падбор лекавых прэпаратаў на аснове малекулярных характарыстык пухліны.

Прымяненне новых супрацьпухлінных прэпаратаў, якія ўздзейнічаюць на малекулярным узроўні (іх называюць таргетнымі, ад слова «мішэнь»), патрабуе вызначыцца з эфектыўнасцю лекавай тэрапіі, — а для гэтага неабходна скласці своеасаблівы малекулярны партрэт. У аддзяленні генетыкі праводзіцца аналіз малекулярнага профілю пухлін з выкарыстаннем метадаў палімеразналанцуговай рэакцыі, секвеніравання і іншых. Малекулярны профіль, дарэчы, ствараецца на працягу чатырох дзён, а выкарыстоўваюцца для гэтага клеткі выдаленай пухліны.

У новым будынку, у якім размяшчаецца лабараторыя канцэрагенезу і якую наведаў спадар Радзівіл, працуе 83 спецыялісты, біёлагі і медыкі, некаторыя з іх працавалі за мяжой. Спецыялісты прадэманстравалі суперсучасную тэхніку і расказалі, для чаго яна прызначана.

— Даследаванні, уключаныя ў пратаколы лячэння, праводзяцца для жыхароў Беларусі бясплатна, хоць кошт, напрыклад, аналізу таго ж малекулярнага профілю пухлін даходзіць да тысячы долараў, — тлумачыла наведвальнікам загадчыца лабараторыі, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук Ганна Парцянко. — Іншая рэч, калі ў пацыента няма паказанняў, але ён жадае прайсці такое даследаванне, і ў яго ёсць магчымасць аплаціць паслугу. У той час як многія краіны ідуць па шляху змяншэння дыягнастычных мерапрыемстваў і накіравання асноўных фінансаў непасрэдна на лячэнне, мы трымаемся іншага падыходу — пашыраем пратаколы дыягностыкі, уносім туды ўсё новыя і новыя малекулярна-генетычныя маркёры, каб праводзіць лячэнне максімальна дакладна і адэкватна, што павінна знізіць яго кошт у канчатковым выніку. Мы мяркуем, што лепей спачатку затраціць каля тысячы долараў на падобнае тэсціраванне, каб дакладна ўстанавіць, да якога хіміятэрапеўтычнага лячэння будзе адчувальны хворы. Усё ж такі кошт лячэння аднаго пацыента можа дасягаць 40 тысяч долараў у год.

У адным з падраздзяленняў лабараторыі канцэрагенезу плануюць заняцца і вырошчваннем штучных органаў, а пакуль тут вылучаюць клеткі крыві, якія «навучаюць» атакаваць клеткі пухліны. Яшчэ ў адным аддзяленні — чыпавых тэхналогій — выпрацоўваюць рэагенты на ПЛР айчыннай вытворчасці.

Міністры наведалі таксама абноўленае ўралагічнае аддзяленне цэнтра анкалогіі, а затым падпісалі мемарандум у памяшканні адзінага ў краіне ПЭТ-цэнтра. Дарэчы, дыягностыка і лячэнне злаякасных новаўтварэнняў на сучасным этапе ўжо немагчымыя без пазітронна-эмісійнай тамаграфіі. Выкананне такога даследавання прадугледжвае індывідуальны падыход у лячэнні кожнага пацыента. Сучаснае медыцынскае абсталяванне дазваляе развіваць тэхналогіі і ў Польшчы, і ў Беларусі. Гэта спрыяе, у сваю чаргу, выхаду на праекты і гранты Еўрасаюза.

Паводле слоў Канстанціна Радзівіла, абмен інфармацыяй, больш цеснае ўзаемадзеянне застаюцца вельмі важнымі, нягледзячы на тое, што пакуль сістэмы аховы здароўя ў нашых краінах адрозніваюцца. Праўда, ужо зараз польскі бок разглядае магчымасць пераходу са страхавой сістэмы на дзяржаўную. У апошнія гады найбольш плённа развіваюцца сумесныя праекты польскіх клінік з медустановамі Брэстчыны і Гродзеншчыны.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2017

# ВЫПРАБАВАННЕ НА ПРАФПРЫДАТНАСЦЬ ДЛЯ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ

**Інструкцыю па правядзенні гутаркі з выпускнікамі профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць без экзаменаў на педагагічныя спецыяльнасці ў ВНУ, зацвердзіла Міністэрства адукацыі.**

Гутарка праводзіцца з мэтай выяўлення асобасных, дзелавых якасцяў, здольнасцяў і матывацыі абітурыентаў да атрымання адукацыі па педагагічных спецыяльнасцях. Да яе дапускаюцца выпускнікі педкласаў, якія маюць у дакуменце аб адукацыі адзнакі не ніжэйшыя за 7 балаў па ўсіх вучэбных прадметах і адзнакі не ніжэйшыя за 8 балаў — па вучэбных прадметах, якія адпавядаюць прадметам профільных уступных іспытаў (пры наяўнасці рэкамендацыі педсавета ўстановы адукацыі, якую яны скончылі).

Пры гэтым абітурыент, які праходзіць гутарку, удзельнічае ў конкурсе, які па рашэнні прыёмнай камісіі ўстановы вышэйшай адукацыі можа праводзіцца па факультэце, групе факультэтаў, спецыяльнасці, групе спецыяльнасцяў. Заданні (пытанні) для правядзення гутаркі складае камісія ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай факультатыўнага занятку «Уводзіны ў педагагічную прафесію. X—XI класы».

Гутарка праводзіцца ў вуснай форме. Рашэнне аб яе праходжанні або непраходжанні прымаецца простай большасцю галасоў членаў камісіі. Калі абітурыент не згодны з вынікам гутаркі, ён можа падаць апеляцыю на імя старшыні камісіі ў дзень яе правядзення. Апеляцыя падлягае разгляду ў дзень яе падачы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Сацыяльны клопат

# Разам з мамай

**Пасля рэканструкцыі ў гомельскай папраўчай калоніі № 4 адкрыўся Дом дзіцяці. Улазіны разам з дарослымі адзначылі 34 малых, дваццаці з якіх яшчэ няма і года, а сямёра нарадзіліся сёлета.**

Дом дзіцяці быў створаны 56 гадоў таму. Дзеці, народжаныя за кратамі, да трох гадоў жывуць на тэрыторыі папраўчай установы разам з асуджанымі матулямі. У калоніі падлічылі, што за ўвесь перыяд існавання тут выхоўвалася больш за 2,6 тысячы малых. Сёння асуджаныя жанчыны маюць магчымасць бачыць дзяцей два разы ў дзень па буднях і чатыры — па выхадных.

— Тут мы прывіваем мацярынскія пачуцці, — кажа **начальнік Дома дзіцяці папраўчай калоніі Марыя ЗАПАРОВАНАЯ.** — Яны кожную вольную хвіліну імкнуцца знаходзіцца з дзеткамі, і мы бачым станоўчы эфект.

Рэканструкцыя Дома дзіцяці па ініцыятыве Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Беларусі пачалася летась. Цалкам замянілі пакрыцці падлогі, сцен і столяў, аконныя і дзвярныя блокі. Абнавілі абсталяванне, мэблю і інвентар. На тэрыторыі абсталявалі дзіцячую пляцоўку. Міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч адзначыў, што пасля капітальнага рамонту створаны ўсе неабходныя ўмовы для знаходжання і развіцця дзяцей:

— Уся тэхніка сучасная, усе матэрыялы айчынныя, экалагічныя. Думаю, у нас атрымалася зрабіць трохі шчаслівейшымі тых дзетак, якія не па сваёй волі павінны знаходзіцца першыя гады свайго жыцця за кратамі.

Музычная тэхніка, бытавыя прыборы, мэбля, цацкі — падарункі ад удзельнікаў урачыстага адкрыцця — спатрэбяцца. Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна Шчоткіна гаворыць, што маці, дзе б яна ні знаходзілася, заўсёды будзе самым цёплым і блізкім чалавекам для любога дзіцяці:

— Трэба зрабіць усё для таго, каб мамы вярнуліся ў грамадства: жыць, працаваць, вучыцца, выхоўваць і паднімаць сваіх дзяцей.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*


**Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельного участка для строительства объектов (ул. Урицкого, 23, пр. Космонавтов) в городе Гродно 26 мая 2017 года**

| № лота | 1 | 2 |
|---|---|---|
| Наименование объекта | Право аренды земельного участка У-1 сроком на 25 лет | Право аренды земельного участка сроком на 25 лет |
| Местонахождение объекта | ул. Урицкого, 23 | пр. Космонавтов |
| Площадь земельного участка (га) | 0,0291 | 0,1834 |
| Кадастровый номер | 440100000002009105 | 440100000001009888 |
| Начальная цена (руб.) | 13 904,24 | 81 132,32 |
| Сумма задатка (руб.) | 1 300,0 | 8 200,0 |
| Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | 3 383,6 | 4 929,34 |
| Условие продажи и целевое назначение земельного участка | Строительство административно-торгового 2-этажного здания со скатной кровлей либо с мансардным этажом | Строительство 2-3-этажного здания с подземной парковкой для общественного питания (1000–1500 кв. м) с помещениями административного, торгового и бытового назначения (1500–2000 кв. м) |

* – земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 26 мая 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 26 апреля по 22 мая 2017 года.** Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46.** Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221282904601000221, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, участок №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Княжное), придорожные полосы (контролируемые зоны) автомобильных дорог. **Нач. цена:** 2 000 руб. **Задаток:** 200 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314060086 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Зароновский сельисполком) |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221288503601000664, площадью 0,1488 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, аг. Тулово, ул. Центральная, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена:** 8 879,76 руб. **Задаток:** 888 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314130147 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Туловский сельисполком) |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221285909101000046, площадью 0,1447 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Лущиха, ул. Набережная, участок №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина). **Нач. цена:** 2 500 руб. **Задаток:** 250 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090173 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельисполком) |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221285909601000526, площадью 0,1498 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, аг. Мазолово, ул. Центральная, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена:** 3 760,93 руб. **Задаток:** 377 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090173 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельисполком) |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым №221284810101000098, площадью 0,1465 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок №5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена:** 4 000 руб. **Задаток:** 400 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314080109 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Летчанский сельисполком) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 29.05.2017 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 26.04.2017 с 8.30 по 26.05.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся); получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома (для лотов №1, №5), получить в установленном порядке разрешение Витебского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет (для лотов №2-4); приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома; осуществить строительство в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно проектно-сметной документации. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
26 красавіка 2017 г.
№ 14 (398)

НАПЯРЭДАДНІ

## Старая маёмасць на новы лад

*Мінская вобласць прадэманструе, як уцягваць у абарот камунальную маёмасць, якая не выкарыстоўваецца*

**Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі правядзе чарговае выязное пасяджэнне ў Мінскім і Дзяржынскім раёнах. У гэту пятніцу члены Савета наведаюць шэраг прадпрыемстваў, дзе абмяркуюць лепшыя практыкі работы па азначанай тэме.**

У Заслаўі будзе разглядацца вопыт стварэння вытворчасці на базе маёмасці, якая неэфектыўна выкарыстоўвалася. Дзе знайсці інвестара і як з ім працаваць, раскажа дырэктар ТАА «Марк-Фармэль» Андрэй Серыкаў. Прадпрыемства шые адзенне не толькі для беларусаў: філіялы ёсць і ў Расіі, Украіне, Казахстане. **Старшыня Заслаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Святлана КАРТАШОВА** расказала, што на месцы «Марк-Фармэля» раней была карданажная фабрыка — горадаўтваральнае прадпрыемства, на якім працавала 1700 чалавек. Але пасля распаду Савецкага Саюза яно стала незапатрабаваным. Становішча складвалася сумнае, пакуль не прыйшоў новы інвестар. Ён захаваў вытворчасць гофраўпакоўкі і пачаў вырабляць шкарпэткі і панчохі.

— Каля Мінска няма праблемы з увядзеннем у абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца. Калі пачынаюць працаваць такія прадпрыемствы, вакол наводзіцца парадак, ствараюць новыя працоўныя месцы. Гэта надае імпульс сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёна. Да таго ж пры добрым менеджменце можна выйсці на значны прыбытак, а гэта галоўная мэта як для прыватнага, так і для дзяржаўнага прадпрыемства, — адзначыла Святлана Карташова.

Надзённая тэма — стварэнне новых рабочых месцаў. Пра такі вопыт з прыцягненнем замежнага капіталу раскажа дырэктар Фаніпальскага завода вымяральных прыбораў «Энергамера». Прадпрыемства мае ўласнае канструктарскае бюро і распрацоўвае новыя прыборы разам з расійскімі карпаратыўнымі партнёрамі. Працуюць з аўтаматызаванымі сістэмамі ўліку электраэнергіі, а таксама забяспечваюць гарантыйнае і сэрвіснае абслугоўванне ўласнай вытворчасці.

На выніковым пасяджэнні члены Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання прааналізуюць магчымасці ўвядзення ў абарот камунальнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, падагульняць убачаны вопыт.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ТЭМА ТЫДНЯ

# СТОЙ, ХТО ЕДЗЕ?

## ЦІ ПАТРЭБНЫ ШЛАГБАУМЫ НА ПРЫДАМАВЫХ СТАЯНКАХ


Фота Надзеі БУЖАН.

**ВОСЕННЮ мінулага года ў сталіцы спрасцілі парадак устаноўкі шлагбаумаў у дварах жылых дамоў. Прадстаўнікі дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» чакалі, што жыхары сталіцы пачнуць актыўна адгукацца на ініцыятыву ў вясновы перыяд. Аднак, як на красавіцкай прэс-канферэнцыі заявіла намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання Галіна ГІЛЕВІЧ, заяўкі аб устаноўцы шлагбаумаў усё яшчэ адзінкавыя. Мы паспрабавалі даведацца, ці дапамагае шлагбаум вырашыць праблему з вострым недахопам парковачных месцаў, колькі каштуе гэта «задавальненне» і ці сапраўды ўсё так проста з яго ўстаноўкай.**

### І быццам не складана, але...

Рашэнне аб змяненні парадку ўстаноўкі шлагбаумаў было прынята ў сувязі з вялікай цікавасцю гараджан да гэтага пытання. Але, як аказалася, ад слоў да справы шлях не заўсёды кароткі. Хоць механізм дзеянняў цяпер і больш выразна сфармуляваны, назваць яго лёгкім не паварочваецца язык. Спачатку ініцыятыўная група жыхароў двара арганізоўвае абмеркаванне, падчас якога прымаецца агульнае рашэнне: усё сур'ёзна, прагаласаваць «за» павінны 50% плюс адзін чалавек. Праблема ў тым, што многія прытрымліваюцца прынцыпу «мая хата з краю — хай вырашаюць самі». А трэба ж не толькі вызначыцца «ставім!», але і выбраць пэўны тып і фірму, якая выканае работы.

стар. 4

ЖАНЧЫНА ГОДА

# Прыступкі Алены Алексінай



**Сярод мінулагодніх пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года» — старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў Алена АЛЕКСІНА. Яна названа лепшай у намінацыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва». З Аленай Іванаўнай гутарым пра тое, як бацька вучыў яе чытаць кнігі, а маці — апранацца з густам, пра першае працоўнае месца і студэнцкія шпаргалкі, пра абставіны, якія спрыялі яе станаўленню як кіраўніка і лідара...**

Дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. Гэта менавіта пра яе, пра Алену Алексіну. Буда-Кашалёўскі раён як месца жыхарства яна мяняла толькі калі пасля школы паехала ў Гомель працаваць, а потым вучылася ў гэтым абласным цэнтры ў інстытуце чыгуначнага транспарту (сёння БелДУТ):

— Мы з сястрой Надзеяй, якая старэйшая за мяне на сем гадоў, нарадзіліся ў звычайнай вясковай сям'і ў пасёлку Беразіна Буда-Кашалёўскага раёна. Бацька ў мяне — звычайны сельскі мужык Іван Савельевіч Ткачоў. Усё жыццё да смерці, якая спасцігла яго заўчасна, у 59 гадоў, адпрацаваў на чыгунцы. Ён быў чалавекам вельмі адказным. Маці Яўгенія Кірэеўна працавала ў гаспадарцы, а потым выраблява бетон у мясцовай ПМК. Для ўсіх быў заведзены строгі распарадак дня. Мы ішлі ў школу пазней за бацькоў, але ўсе мусілі снедаць разам. Было правіла: сняданак і вячэра — абавязкова з сям'ёй. За сталом вырашаліся нейкія пытанні, дый проста мама пераконвалася, што мы не засталіся галоднымі. Цяпер разумею, наколькі гэта дысцыплінавала і стварала сямейную агульнасць. Да таго ж бацькі ніколі пры дзецях не высвятлялі адносіны. Па гаспадарцы мы ўсё рабілі разам. Маці ставіла задачу: што трэба выканаць да яе вяртання. Праўда, калі не спраўляліся — толькі адчытвалі, фізічна ніколі не каралі. Толькі аднойчы атрымала аплявуху: калі дазволіла сабе ўмяшацца ў размову дарослых.

***— Каса на камень не находзіла? Бо і маці, і вы з лідарскімі якасцямі...***

— Не. Бацькі ўмелі выхоўваць, і мы іх паважалі. У вёсцы нельга паводзіць сябе так, каб людзі з цябе смяяліся. Грамадская думка заўсёды прысутнічала як ступень кантролю. Мне здаецца, і іншыя так жылі — каб не даваць падставы для нейкіх вясковых размоў. Можа, і гэта паслужыла развіццю лідарскіх якасцяў. Пастаянна трэба было да нечага імкнуцца, не адкладваць справы ў доўгую скрыню...

***— У школе, відаць, усе вяршкі былі вашымі?***

— Так. І спяваць хацела, хоць не было добрага слыху. Адбіралі ў хор, я вельмі старалася, пела на розныя матывы. Сёння ўяўляю, як гэта было смешна. Сольна выступаць мне не дазволілі, але ж у хор паставілі. Хутка стала вядучай на канцэртах. Памятаю: мне завязалі піянерскі гальштук, і я ішла па веснавому бездарожжу з Бушаўскай школы дадому. У гумовых ботах, куртка нарасхрыст — усе павінны бачыць, што я піянерка. Потым узначальвала піянерскую дружыну, камсамольскую арганізацыю школы. Нават на Новы год была чарнявай Снягуркай. Удзельнічала ва ўсіх конкурсах самадзейнасці і школу закончыла з залатым медалём.

стар. 6

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Бліжэй да практыкі

*Сенатары абмеркавалі адукацыю ў медыцынскай сферы*

**На мінулым тыдні Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці правяла круглы стол «Шляхі ўдасканалення вышэйшай медыцынскай адукацыі і навукі ў Рэспубліцы Беларусь» на базе Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.**

На думку Ірыны Старавойтавай, старшыні Пастаяннай камісіі, у вырашэнні праблемы падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў у Беларусі важна захаваць існуючыя прыярытэтныя пазіцыі, асабліва цеснае ўзаемадзеянне сістэмы адукацыі ў ахове здароўя і навукі. «Мабыць, менавіта ў сістэме вышэйшай адукацыі медыцынскіх кадраў мы бачым самыя сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і, што вельмі важна, наймацнейшую практычную падрыхтоўку медработнікаў. Гэта дазваляе ім заставацца канкурэнтаздольнымі ў сусветнай супольнасці», — адзначыла сенатар.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел члены Пастаяннай камісіі. Адзін з іх, які і прымаў калег, — Віктар Сняжыцкі, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Удзельнікі таксама пазнаёміліся з работай аб'ектаў аховы здароўя рэгіёна. Гродзенская вобласць і Гродзенскі медуніверсітэт выбраны месцам для абмеркавання гэтых пытанняў невыпадкова: тут ёсць наватарскія ідэі, вопыт, і дасягнуты пэўныя вынікі працы, у першую чаргу практыка-арыентаванае навучанне, якое ВНУ развівае на высокім узроўні.

## Адзіная прастора дзвюх дзяржаў

*Члены верхняй палаты імкнуцца да гарманізацыі заканадаўства*

**Адбылося пасяджэнне Камісіі Парламенцкага Сходу (ПС) Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўстве і рэгламенце. Гэтым разам яго зладзілі ў Магілёве. Ад Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі ўдзельнічалі старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Віктар Чайчыц. У мерапрыемстве таксама прынялі ўдзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.**

Падчас пасяджэння быў разгледжаны шэраг пытанняў, якія тычацца гарманізацыі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі і забеспячэння роўных правоў грамадзян Саюзнай дзяржавы ў сферы міграцыі, фарміравання адзінай міграцыйнай прасторы і адзінай візавай прасторы, урэгулявання пытанняў уласнасці Саюзнай дзяржавы.

Акрамя таго, міжнародным супрацоўніцтвам на мінулым тыдні актыўна займаўся і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў. Ён прыняў удзел у пасяджэнні рабочай групы па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення спецыялізаванай выставы, якая пройдзе ў рамках чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі 29—30 чэрвеня 2017 года ў Маскве, правёў сустрэчы з дэлегацыяй Народнай Рэспублікі Бангладэш, паслом Кыргызстана ў Беларусі, а таксама з прадстаўнікамі японскай кампаніі «Дэлойт Тамацу Кансалтынг».

## Адзначылі сайт

*Інтэрнэт-старонку Савета Рэспублікі ўзнагародзілі прэміяй*

**У мінулы чацвер у рамках XXIV Міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІБО-2017» адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу «Інтэрнэт-прэмія» «ТІВО-2017».**

Найлепшыя беларускія інтэрнэт-рэсурсы сёлета вызначалі па 9 намінацыях. У адной з іх — «Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання», другое месца заняў афіцыйны інтэрнэт-сайт Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, распрацоўшчыкам якога з'яўляецца РУП «БелТА».

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ВІЗІТ

# У ХУТКІМ ЧАСЕ — У ЛАТВІЮ

**На пачатку мая парламенцкая дэлегацыя наведае гэту прыбалтыйскую краіну**

**АДНОСІНЫ, якія добра складваюцца, лёгка заўважыць. Так, сустрэча Марыяны Шчоткінай, намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, і Марціньша Вірсіса, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Латвійскай Рэспублікі ў нашай краіне, прайшла ў сяброўскай, нязмушанай абстаноўцы. Было відавочна, што бакі зацікаўлены адно ў адным і гатовыя да ўзаемнай работы.**



Фота з сайта Савета Рэспублікі.

Падчас сустрэчы. Марціньш ВІРСІС, Марыяна ШЧОТКІНА і Сяргей РАХМАНАЎ (злева направа).

Віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыла, што зараз надаецца важнае значэнне парламенцкаму супрацоўніцтву нашых краін. "Яно ў нас даволі моцнае. Ужо адбылося шмат узаемных візітаў, працуе каля 50 двухбаковых пагадненняў. Як бачым, работа ў гэтым кірунку ўжо наладжана, — адзначыла сенатар. — Да таго ж мы зробім усё магчымае, каб нашы дзяржавы працягвалі ўмацоўваць узаемнае супрацоўніцтва».

Сярод прыярытэтных кірункаў беларуска-латвійскіх кантактаў — пытанні межаў, міграцыі, эканомікі, нацыянальнай бяспекі. Па словах Марыяны Шчоткінай, беларускі бок цікавіць, акрамя палітычнага складніка, і эканамічны кампанент: гандлёвыя адносіны, сумесныя прадпрыемствы. Экспарт беларускай прадукцыі ў Латвію ўжо адбываецца больш чым па 500 таварных пазіцыях. Гэта і нафтапрадукты, і хімічная прадукцыя, і дрэваапрацоўка. Зараз таксама абмяркоўваюцца пытанні магчымых латвійскіх інвестыцый у дрэваапрацоўчую прамысловасць Беларусі. «Мы гатовы садзейнічаць умацаванню сувязяў па ўсіх кірунках, таму што для нас супрацоўніцтва з Латвіяй — прыярытэтны кірунак дзейнасці», — падкрэсліла віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

У сваю чаргу Марціньш Вірсіс выказаў зацікаўленасць «у цесным і сяброўскім супрацоўніцтве», што, па яго словах, увасабляецца ў канкрэтных дзеяннях. З канца 2015 года адносіны паміж беларускім і латвійскім парламентамі ўсё больш умацоўваюцца. «Развіццё парламенцкіх сувязяў — гэта важны складнік двухбаковага супрацоўніцтва», — адзначыў пасол і выказаў шчырую зацікаўленасць у далейшым умацаванні дыялогу.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ДА ФОРУМУ РЭГІЁНАЎ

# ГАЛОЎНАЕ — ЭКАНОМІКА,

## або Пад ляжачы камень вада не бяжыць

**Усяго за некалькі месяцаў заключаны больш за 20 пагадненняў паміж органамі мясцовага самакіравання і кіравання Віцебскай вобласці і Цвярской, Пскоўскай, Смаленскай абласцей Расіі.**

**Беларусы выходзяць на больш шчыльнае супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі і гарадамі. І спрабуюць праз рэгіёны больш актыўна працаваць з Расійскай Федэрацыяй. Падпісваюцца і будуць падпісвацца — дамовы эканамічнага характару.**

**А нядаўна афіцыйная дэлегацыя Віцебшчыны на чале са старшынёй абласнога Савета дэпутатаў Уладзімірам ЦЯРЭНЦЬЕВЫМ пабывала ў Цвярской вобласці.**

### ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ ПА ПРЫВАБНАЙ ЦАНЕ

Беларусы зацікавілі расіян прапановамі пастаўкі прадуктаў. У сваю чаргу, апрача іншага, вывучылі практыку замкнутага цыкла вытворчасці «ад поля да прылаўка». Не выключаецца, што ствараць сумесныя прадпрыемствы.

У Прыдзвінскім краі чакаюць цвярчан да сабе. І туды, калі рыхтаваўся артыкул, збіраўся адправіцца беларускі «дэсант» прадстаўнікоў прадпрыемстваў, каб заключаць дамовы.

— Падпісалі пратакол аб супрацоўніцтве паміж аблсаветам і заканадаўчым сходам Цвярской вобласці. Дакумент будзе спрыяць узаемадзеянню органаў самакіравання. Наконт эканамічнага «блока» — адпаведнае пагадненне будзе замацавана на паперы ў найбліжэйшы час.

Увогуле, на цвярской зямлі нас цудоўна прымалі. Адчувалі сябе як дома, хоць праграма была вельмі насычаная, — падзяліўся ўражаннямі Уладзімір Цярэнцьеў.

Старшыня аблсавета падкрэсліў, што з расіянамі трэба актыўней працаваць, бо вынікі бачны адразу. Мы можам пастаўляць на расійскі рынак тое, чаго ў іх няма, недастаткова.

— Сыры, хлеб, кандытарскія вырабы, шэраг малочных прадуктаў, птушку сёння можам экспартаваць... Калі хочам зайсці на расійскі рынак, неабходна мець вельмі выгадныя прапановы, і адпаведнасцю цаны і якасці. А мы можам гэта зрабіць, — працягвае Уладзімір Цярэнцьеў.

### ХЛЕБ НА ЭКСПАРТ

Расіянам у ліку іншага прапанавалі пастаўляць і хлеб. Як падлічылі спецыялісты, яго ў класічным выглядзе выгадна вазіць на адлегласць не больш за 600 кіламетраў. А вось замарожаны — хоць на іншы кантынент.

— У Цвярскую вобласць будзем пастаўляць хлеб подавы заварны (такі хлеб выпякаецца на хлебапякарным лісце, бляхе і г. д.). Такога няма там. Яго плануюць рэалізоўваць праз гандлёвую сетку, якая налічвае да 100 крамаў, — расказвае **генеральны дырэктар ААТ «Віцебскхлебпрам» Міхаіл РОГ**.

У Смаленскую, Пскоўскую вобласці, Маскву і Санкт-Пецярбург віцебскія хлебапёкі ўжо ажыццяўляюць пастаўкі. Экспарт на ўзроўні 10%. Летась дзякуючы яму зарабілі больш за 1,7 мільёна долараў. Дзякуючы Цвярской вобласці сёлета плануюць пераадолець «рубеж» у 2 мільёны.

Цікава, што восенню на «Віцебскхлебпраме» запусцяць лінію па вырабе замарожаных хлябоў. Таксама плануецца пастаўка чорнага хлеба ў рэспублікі Сярэдняй Азіі і Ізраіль.

### ДЛЯ ЛАСУНОЎ

А яшчэ задумалі рэалізоўваць у Цвярской вобласці шмат найменняў салодкай прадукцыі, але ўжо ад іншага віцебскага вытворцы.

— З гэтым рэгіёнам супрацоўнічаем каля года. Раней працавалі пад гандлёвай маркай, распрацаванай у Расіі. Цяпер ёсць дамоўленасць аб вывядзенні на рынак нашай гандлёвай маркі, — гаворыць **першы намеснік генеральнага дырэктара кандытарскай фабрыкі «Віцьба» Уладзімір САЗОН**.

З фабрыкай супрацоўнічае сур'ёзная кампанія — у яе 5 лагістычных цэнтраў і 8 філіялаў у Цвярской, Пскоўскай, Наўгародскай абласцях.

Падчас візіту ў Цвер правялі перамовы і з кіраўніцтвам запраўачных сетак расійскай вобласці (больш за 40 заправак) — іх зацікавіў прадукт «Віцьбы» дробнай фасоўкі (да 50 грамаў). Будуць запатрабаваныя вафельная прадукцыя, падушачкі з начынкай — гэта хуткі, зручны і даступны перакус.

Уладзімір Сазон падкрэсліў, што з расіянамі трэба супрацоўнічаць шчыльна. Бо ў нас фактычна агульныя рынак і менталітэт, падобныя прадукты ў рацыёне. Тым больш што «Віцьба» — унікальны вытворца, больш за 95% асартыменту прадпрыемства больш нікім не вырабляецца.

Расіян вельмі цікавіць і супрацоўніцтва ў галіне лясной гаспадаркі. У прыватнасці, яны гатовы набываць саджанцы ёлкі. Кіраўнік аблсавета збіраўся ў найбліжэйшыя дні сустрэцца з кіраўніцтвам лясгасаў, каб выпрацаваць адзіныя пазіцыі ў гэтым пытанні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*



Падчас наведвання вытворчага аб'яднання ў Цвярской вобласці, якое спецыялізуецца на сельскагаспадарчай вытворчасці.

ПАСТФАКТУМ

# ПРАМЫ КАНТАКТ З НАРОДАМ

## ПАРЛАМЕНТАРЫІ ПРА ПАСЛАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

**Гэта, безумоўна, адна з самых яркіх падзей у жыцці парламента нават у маштабе года. Зварот кіраўніка дзяржавы — у першую чаргу прамая інструкцыя: як і што трэба рабіць. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі выказаліся наконт таго, што кожны з іх вынес з выступлення лідара краіны.**



**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:**

— Мы вельмі шмат увагі ўдзяляем навуцы для таго, каб ствараць навукаёмістыя вытворчасці, каб наша прадукцыя, якую мы вырабляем, і паслугі, якія мы аказваем, былі канкурэнтаздольнымі на знешніх рынках, таму што без такога развіцця няма руху наперад.

Калі мы цяпер не ўзмоцнім свой патэнцыял, невядома, што будзе заўтра — застанемся на задворках. Таму развіццё сяброўскіх адносін з лацінаамерыканскімі краінамі, напрамак Паўднёва-Усходняй Азіі — гэта вельмі перспектыўныя рынкі, і кіраўнікі з гэтых дзяржаў, якія прыязджаюць у Беларусь, вядома, бачаць прывабнасць і інвестыцыйнага клімату, і тых паслуг, якія мы прапануем. Усе адзначаюць, што наша вытворчасць вельмі прывабная, таму неабходна развівацца і далей у гэтым кірунку.

У нас наметаліся сур'ёзныя зрухі ў адносінах як з ЗША, так і з ЕС. Кажуць, што Беларусь — тая пляцоўка, на якой трэба выбудоўваць адносіны на роўных. Летняя сесія ПА АБСЕ, якая будзе праходзіць у Мінску, таму пацвярджэнне. Мы адкрытыя, і скептычныя заявы з боку Еўрасаюза — яны існуюць, але іх становіцца ўсё менш. Гэта сведчыць пра тое, што Еўропа гатова да дыялогу з Беларуссю. І той факт, што той жа самы Еўрапарламент пачынае ўсё больш супрацоўнічаць з дзяржавай, а не з апазіцыяй, гэта пацвярджае.



**Максім МІСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве:**

— Сапраўды акрэслены кірункі, пазіцыі. Выказана шчырае меркаванне кіраўніка дзяржавы, у якіх прыярытэтных кірунках мы сёння павінны працаваць — гэта датычылася і ўрада, і дэпутатаў. Ён падкрэсліў, што сёння заканадаўчая галіна ўлады ў асобе дэпутатаў — гэта тая камунікацыя з людзьмі, якая сапраўды найбольш важная. Як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, па многіх пытаннях людзі часам не зусім правільна разумеюць тыя рашэнні, якія прымаюцца. Вось тут роля дэпутатаў якраз дастаткова важная для таго, каб вызначыць тыя ці іншыя пазіцыі.



**Людміла НІЖЭВІЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах:**

— Дакладна выказана пазіцыя Прэзідэнта, што Беларусь — суверэнная дзяржава, якая гатова адстойваць свае інтарэсы на міжнароднай арэне, што мы — міралюбная дзяржава, якая сканцэнтравана на развіцці нашага грамадства.

Асноўныя задачы, якія пастаўлены Прэзідэнтам, — занятасць насельніцтва, павышэнне зарплаты. Вызначаны шляхі, па якіх мы можам дасягаць гэтых мэт — за кошт развіцця прадпрыемстваў, павелічэння экспарту, прыцягнення інвестыцый. Пры гэтым трэба не проста паляпшаць інвестыцыйны клімат, а глыбей і больш працаваць над прыцягненнем інвестараў. Работа гэтая праводзіцца на недастатковым узроўні, але менавіта прыцягненне інвестараў дапаможа эканоміцы развівацца больш хуткімі тэмпамі.

У цэлым Пасланне прайшло ў пазітыўнай атмасферы. Грамадзяне, якія сочаць за развіццём нашай краіны, якія неабыякавыя, я думаю, атрымалі адказы на многія пытанні. Парламентарыі змаглі задаць Прэзідэнту ўсе пытанні. Такія адносіны дапамагаюць аператыўна рэагаваць на праблемы і выпрацоўваць канструктыўныя рашэнні, якія будуць дапамагаць краіне рухацца наперад. У цэлым такая форма зносін мае добрую выніковасць, бо такім шляхам вырашаюцца сур'ёзныя для краіны задачы.



**Канстанцін ВІЛЬЧУК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— Падчас Паслання былі пастаўлены канкрэтныя задачы перад сферай аховы здароўя, якія ў першую чаргу датычацца арганізацыі работы першаснага звяна, а таксама распрацоўкі, стварэння высокіх тэхналогій, што дазволяць не толькі палепшыць здароўе нашага насельніцтва, але і дадуць магчымасць развівацца экспарту медыцынскіх паслуг.

Адной з тэм Паслання стала і павелічэнне сярэдняй працягласці жыцця да 75 гадоў. Як мэтавы паказчык, на мой погляд, такая задача выканальная для нашай краіны, бо ўзровень сучаснай беларускай медыцыны ў поўнай ступені дае магчымасць паніжаць захворванні і смяротнасць сярод усіх катэгорый пацыентаў.



**Віктар СІРЭНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— Шмат у Пасланні Прэзідэнта было звязана з сацыяльнай палітыкай: гэта клопат пра людзей, Дэкрэт №3, узроўневыя адносіны ў сістэме аховы здароўя, а таксама пытанні, што датычацца культуры, адукацыі, у тым ліку ў сельскіх школах. Кола пытанняў разнастайнае, і яны патрабуюць не толькі абмеркавання, але і дэталёвай прапрацоўкі з нашага боку.

**Вераніка ПУСТАВІТ** *pustavit@zviazda.by*,
**Надзея ЮШКЕВІЧ** *yushkevich@zviazda.by*.

АГУЛЬНАЯ СПРАВА

# Паклапаціліся пра будучыню

## Члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў дружна выйшлі на суботнік

*У Савеце Рэспублікі сёлета вырашылі дапамагчы ў будаўніцтве, што разгарнулася на тэрыторыі Інстытута мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук. Побач з адміністрацыйным будынкам установы ўжо стаіць другі, у якім у хуткім часе размесціцца Навукова-вытворчы цэнтр біятэхналогій. У гэтым годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю яго першы пускавы комплекс.*

Па словах **Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі**, лагічна, што ў Год навукі суботнік парламентарыі праводзяць менавіта ва ўстанове навукі. «Тут ствараецца вытворчасць па выпуску 20 тон сухіх прабіётыкаў у год. Гэта фактычна 20 тысяч тон камбікармоў для жывёлагадоўлі. Другая лінія, што тут арганізоўваецца, — мікробныя прэпараты для раслінаводства. Фактычна гэтыя сродкі замяняюць жорсткія хімічныя прэпараты, за якія нас часам крытыкуюць спажыўцы, у тым ліку ў Расійскай Федэрацыі, напрыклад, калі адшукваюць у ялавічыне антыбіётыкі», — сказаў спікер і дадаў, што да таго ж такія сродкі не шкодзяць здароўю чалавека і навакольнаму асяроддзю.

На думку сенатара, біятэхналогіі — менавіта той сектар эканомікі, які сёння патрэбны нашай краіне. Невысокая матэрыяла- і энергаёмістасць, нізкі кошт і пры гэтым рынкі, якія растуць, як унутраны, так і замежны — усё гэта будзе толькі спрыяць развіццю сферы. Так, прадпрыемства на базе Інстытута пакуль не працуе, але папярэднія заказы ўжо паступілі з Расіі, выпрабаванні прэпараты ўжо праходзяць у Турцыі. «Прадпрыемства яшчэ не ўведзена ў эксплуатацыю, а партфель заказаў сфарміраваны. Факты кажуць самі за сябе. Я бачу за біятэхналогіямі перспектыву», — падсумаваў Міхаіл Мясніковіч.

* * *

*На суботніку дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі высаджвалі дрэвы ў парку «Цівалі». На гэтым месцы будзе пабудавана адзіная ў Мінску інтэрактыўная дзіцячая пляцоўка.*

Пакуль што парк уяўляе сабой вялікую тэрыторыю з мноствам пагоркаў і вадаёмаў. Цяпер гэта мясціна актыўна прыводзіцца ў парадак, зялёныя зоны рэканструююцца, закладваюцца новыя алеі і сцяжынкі для пешаходаў. **Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу**, адзначыў, што добраўпарадкаванне гэтай зоны ўжо становіцца традыцыйнай справай для дэпутатаў:

— Члены Палаты прадстаўнікоў новага склікання і летась былі ў гэтай гістарычнай мясціне. Многія ведаюць, што замежныя госці, калі прыязджаюць у Мінск, заўважаюць, колькі тут зелені. Аднак пакуль што ў новабудоўлях Фрунзенскага раёна зеляніны мала. Гэта адзін з нямногіх раёнаў Мінска, дзе не выконваецца нарматыў па пасадках. Таму дэпутаты сёння робяць свой унёсак, каб кампенсаваць згаданы прабел. Мяркую, што ў перспектыве тут з'явіцца цудоўны парк, камфортная інфраструктура, дзе змогуць адпачываць мамы з маленькімі дзецьмі.



Акрамя зоны спакойнага адпачынку з алеямі, клумбамі і масцікамі цераз вадаёмы, у парку Цівалі запланавана будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу, які будзе ўключаць у сябе не толькі пляцоўкі для гульняў, але і спускі для горналыжнікаў, штучныя скалы для тых, хто хоча патрэніравацца ў альпінізме. **Дырэктар УП «Зелянбуд Фрунзенскага раёна» Мікалай АСТАПЕНКА** расказаў, што на месцы, дзе цяпер працуюць дэпутаты, ужо сёлета пачнецца будаўніцтва інтэрактыўнай дзіцячай пляцоўкі.

— Для разнастайнага адпачынку запланавана многае: жыхары раёна змогуць праводзіць гульні для дзяцей, слухаць музыку, займацца фізічнымі практыкаваннямі. І дрэвы, што мы цяпер садзім, стануць аздобай у любую пару, створаць адметны ландшафт.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**
*yurgel@zviazda.by*,
**Вераніка ПУСТАВІТ**
*pustavit@zviazda.by*.

# СТОЙ, ХТО ЕДЗЕ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Калі ўсё ж такі гэты этап паспяхова перададолены, небходна з заявай (у якой будзе інфармацыя аб тым, дзе і якога тыпу шлагбаум плануецца ўсталяваць, як будзе забяспечвацца беспераашкодны заезд спецтэхнікі і якім чынам захаваюцца пешаходныя сувязі) звярнуцца ў раённую адміністрацыю. У выпадку адсутнасці падстаў для адмовы праект прымаецца. Але гэта яшчэ не ўсё.

Далей на чарзе КУП «Мінскі гарадскі цэнтр інжынірынгавых паслуг», дзе цягам месяца складуць архітэктурна-планіровачнае заданне, а таксама збяруць тэхумовы і заключэнні ад узгадняючых арганізацый: канструкцыя не павінна размяшчацца на інжынерных сетках водаправода, каналізацыі, ліўневых сцёкаў, электрычных і газавых сетках. Пасля гэтага ўстаноўку трэба ўзгадніць з камітэтам архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама і, нарэшце, можна прыступаць да саміх работ.

Ва ўсёй гэтай схеме радуе хіба што дакладны алгарытм дзеянняў, а вось прынцып «аднаго акна» ў гэтым выпадку нагадвае больш форму матрошкі: за першым «акном» увесь час ідзе наступнае...

## Любы капрыз за вашы грошы

Праўда, знаходлівым фірмам гэта, наадварот, на руку: яны гатовыя ўзяць на сябе ўстаноўку шлагбаума «пад ключ». Хіба што арганізацыйны сход не праводзяць, а так — усё да вашых паслуг. Стартавы кошт на ўсё, акрамя самога абсталявання, ад 2500 рублёў. Але там, дзе кошт у рэкламных аб'явах пачынаецца «ад», яго трэба памножыць як мінімум на паўтара, а гэта прыблізна 3750 рублёў.

Што да самога шлагбаума, то ад яго розных відаў вочы разбягаюцца — практычна як у модным краме жаночага адзення. Каб не згубіцца ў гэтай разнастайнасці, варта звяртаць увагу на галоўныя параметры. Па-першае, шырыня. Калі праезд досыць шырокі, то больш рацыянальна ўстанаўліваць шлагбаумы з двух бакоў дарогі: на ўезд і на выезд, а не адзін велізарны. Па-другое, гэта хуткасць узняцця. Вядома, можна аддаць перавагу і не самаму хуткаму механізму, але цалкам магчыма, што сэканомленая сума будзе ў выніку выдаткаваная на заспакаяльныя таблеткі для і без таго нервовых кіроўцаў. І па-трэцяе, інтэнсіўнасць выкарыстання. Тут варта адштурхоўвацца ад колькасці жыхароў двара: зразумела, чым яна вышэйшая, тым больш зносаўстойлівы шлагбаум лепш выбіраць. Цана на абсталяванне павялічваецца ад 1500 рублёў і можа ў залежнасці ад спалучэння розных параметраў павялічвацца ў некалькі разоў.

> Прынцып «аднаго акна» ў гэтым выпадку нагадвае больш форму матрошкі: за першым «акном» увесь час ідзе наступнае...

Дарэчы, калі шлагбаум будзе замінаць правядзенню работ па добраўпарадкаванні двара, будаўніцтву або капрамонту будынкаў, яго дэмантаж і паўторны мантаж павінны аплачваць самі жыхары.

Што датычыцца спосабаў узаемадзеяння са шлагбаумам, то пульт дыстанцыйнага кіравання хоць і самы звыклы, але яго паступова выцясняюць больш сучасныя тэхналогіі. Напрыклад, GSM-модулі. У гэтым выпадку шлагбаумам можна кіраваць пры дапамозе тэлефонных званкоў, sms або мабільных праграм. Адначасова ў базе могуць знаходзіцца да 2000 абанентаў, прычым можна задаваць параметры наведвання двара, напрыклад, аднаразова або толькі ў пэўныя гадзіны. Гэта важна, бо, акрамя жыхароў, на дваровую тэрыторыю можа заязджаць і службовы транспарт: ад смеццявозаў да машын хуткай дапамогі. Для службовага транспарту ёсць і іншыя спосабы атрымаць доступ да праезда — напрыклад, шлагбаумы могуць адкрываць кансьержкі, можа дзейнічаць сістэма распазнавання спецыяльных нумарных знакаў ці сярод вадзіцеляў будуць распаўсюджаны адзіныя коды доступу.

## «Лепш бы стаянку пашырылі»

Так выглядае «тэорыя», а вось пра яе рэалізацыю на практыцы нам расказалі самі мінчане. У двары дома, дзе жыве Дзяніс Сяргееў, шлагбаумы з'явіліся паўгода таму. Праўда, прызнаецца малады чалавек, сітуацыю яны істотным чынам не змянілі, бо ў дамах абсталяваны падземныя паркінгі, так што ад недахопу машынамесцаў ніхто не пакутаваў. «Гэта быў, хутчэй, капрыз старшыні таварыства ўласнікаў. Але большасць яго адразу падтрымала, працэс пайшоў даволі хутка, перыяд ад абмеркавання да ўстаноўкі заняў каля трох месяцаў. За саму ўстаноўку мы не плацілі, сума была ўзятая з агульных грошай, толькі за бірульку — па меры патрэбы, — якая каштавала 20 рублёў», — расказвае Дзяніс. Адзінае — цяпер у двор не могуць уехаць таксісты. У астатніх выпадках праблемныя сітуацыі вырашае дыспетчар.

А ў Кацярыны Ваўчок у двары толькі ідзе падрыхтоўчая работа да ўстаноўкі шлагбаума. «Нашаму дому, які знаходзіцца ў мікраараёне Ангарская, крыху больш за тры гады». У двары пабудавана свая стаянка, якую... аблюбавалі жыхары ўсіх навакольных дамоў! Іх не бянтэжыць папярэджальны знак, што ўезд дазволены толькі для жыхароў нашага дома, якія ўваходзяць у ТУ. Асабліва востра паўстае гэтае пытанне зімой, калі пасля снегападу людзі чысцяць свае месцы, трацяць шмат сіл, а ўвечары стаянка ўжо нахабна занятая кімсьці іншым. Некалькі разоў мы заводзілі гэтую тэму, але канчаткова дамовіліся толькі пасля зімы, калі трэба было прыводзіць у парадак свае паркавачныя месцы. Наша старшыня сама займаецца гэтым пытаннем, паведамляючы ўсім аб праведзенай рабоце праз дошку аб'яў. Пакуль прайшоў толькі месяц, так што яшчэ чакаем. Мяне пакуль хвалюе толькі тое, як у двор будзе заязджаць дастаўка прадуктаў, бо яна не ўваходзіць у спіс службовага транспарту, якому абавязкова трэба адкрыць доступ», — падвяла вынік Кацярына.

А вось Вольга Гладко ўстаноўкай шлагбаумаў катэгарычна незадаволеная. «Мы жывём на ўскраіне, паблізу няма ніякіх офісаў. Заўсёды занятыя паркавачныя месцы — вынік таго, што іх не хапае нават самім жыхарам. Пасля гэтай бессэнсоўнай працэдуры — устаноўкі шлагбаума — нічога не змянілася. Хто паспеў, таго і тапкі, як кажуць. Лепш бы гэтыя сродкі выдаткавалі на абсталяванне яшчэ некалькіх машынамесцаў».

Усяго ў Мінску колькасць двароў, абсталяваных шлагбаумамі, якія знаходзяцца на абслугоўванні жыллёва-камунальных арганізацый, складае некалькі дзясяткаў. Што будзе далей? Пажывём-пабачым...

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

---

УЛАСНЫ ПОГЛЯД

# Культура і інфраструктура

## ЦІ МОЖНА ВЫЗВАЛІЦЬ ДВАРЫ АД АЎТАМАБІЛЯЎ?

**Забітыя аўтамабілямі двары — суровая беларуская рэчаіснасць. Суровая настолькі, што на гэтай глебе ўзнікаюць нават канфлікты са збіццём. Культуры і інфраструктуры — вось чаго не хапае, каб вырашыць праблему.**

У Мінску аўтаўладальнік пабіў дворніка за тое, што той выклікаў эвакуатар. Здарэнне, якое зрабіла немалы розгалас у беларускіх СМІ. І хоць на момант напісання гэтага артыкула суд яшчэ не паставіў кропку ў гучнай справе, падумаць ёсць над чым. Сама падзея надзвычай сімптаматычная: запаркаванасць гарадскіх двароў даўно перавысіла ўсе разумныя межы. Таму спрэчкі, сваркі і нават бойкі праз пакінутыя пад домам машыны — справа, на жаль, звычайная. Можна выдатна зразумець людзей, якія не могуць прайсці па забітым «жалеззем» тратуары і баяцца выпусціць дзяцей на вуліцу, бо нават у двары ёсць рызыка трапіць пад колы. Але ў той жа час можна зразумець і аўтамабілістаў: за карыстанне машынамі яны плацяць транспартны падатак. І маюць права патрабаваць за гэта пэўных выгод у выглядзе развітой аўтамабільнай інфраструктуры.

Але ёсць яшчэ і пытанне культуры. Нават у сітуацыі, якая пагражае канфліктам, можна заставацца чалавекам і шукаць кампраміс. Заўважце: многія кіроўцы цяпер сталі чапляць на шкло цэтлікі са сваім нумарам мабільнага тэлефона. Маўляў, калі мая машына вам замінае — набярыце, адганю. І гэта цывілізаваны падыход.

> У планах развіцця гарадоў варта ўлічваць той факт, што аўтамабіляў менш не стане. Трэба глядзець у будучыню і прагназаваць развіццё нават не на гады, а на дзесяцігоддзі наперад.

Сапраўды, гарадскія двары звычайна занадта цесныя, і часам фізічна немагчыма прыпаркавацца, не парушыўшы ніводнага правіла. Але ёсць выразная мяжа паміж вымушаным парушэннем і непрыхаваным хамствам. Хоць што кажыце, але заперці машыну на дзіцячую пляцоўку або загнаць пад самы пад'езд так, што з яго немагчыма выйсці, — гэта проста плявок у твар усім астатнім людзям. І менавіта гэты кантынгент аўтамабілістаў звычайна найбольш востра і неадэкватна рэагуе на заўвагі. Бо машына — ніби працяг іх саміх, частка іх асобы. Прычым гэта зусім не абавязкова хрэстаматыйны бамбіза на даражэзным джыпе. Каменем спатыкнення можа быць стары ржавы «корч», які, аднак, дае ўладальніку падставы задраць нос так, што, як той казаў, фігай не дастанеш. Не адпускае некаторых з нас спадчына савецкіх часоў, калі машына сапраўды была раскошай. Не ўсе яшчэ навучыліся культуры валодання аўтамабілем. І таму імкнуцца ўперціся на ім паўсюль, дзе гэта фізічна магчыма. Водаахоўная зона каля пляжа? Лухта! Пад'еду ці не да самай вады: не дзеля таго «самаход» купляў, каб клыпаць пешкі ажно пяцьдзясят метраў. На аўтобусным прыпынку стаянка забаронена? Усё адно кіну «калёсы» і няспешліва пайду ў краму праз дарогу. Я ж на «аварыйку» паставіў? Паставіў! Бо праехаць трошкі далей і прыпаркавацца ў больш прыдатным месцы — лянота.

А цяпер уявім сітуацыю, што нехта з жыльцоў возьме і шпурне з акна ў прыткнуты пад самы пад'езд аўтамабіль, напрыклад, бутэльку. Што будзе рабіць аўтахам? Хутчэй за ўсё, успомніць пра закон, кінецца выклікаць участковага, крычаць і пырскаць слінай, што яго маёмасць пашкодзілі. Хоць на месцы праваахоўнікаў я штрафаваў бы ў першую чаргу заяўніка — за грубае парушэнне правілаў стаянкі.

Але адной культурай праблему не вырашыш. Трэба прымаць нейкія захады на ўзроўні праектавання новых кварталаў. Бо са старымі ўжо нічога не зробіш: яны былі разлічаны на іншыя аўтамабільныя рэаліі. Аднак што мы бачым? Сучасныя мікрараёны ці не цяснейшыя за савецкія. Так, зямля дарагая, а будаваць трэба як мага танней. Падземны паверх з гаражамі? Выдатная ідэя, але тады праект вылецца ў добрую капейчыну. А мы ж мусім эканоміць. Але разам з той эканоміяй атрымліваем невылечную скулу на адным месцы ў выглядзе нявыкруткі з паркоўкай. А гэта ісцінна пагаршае якасць жыцця навасёлаў.

Яшчэ красамоўны прыклад — як у адным беларускім райцэнтры на месцы колішняй вялікай стаянкі пабудавалі не менш вялікі гандлёвы цэнтр. Сучасны магазін — гэта, канешне, добра. Але пра тое, як гэта адаб'ецца на запаркаванасці двароў, ніхто, напэўна, не падумаў.

Аўтамабіль — не раскоша. Для многіх гэта жыццёвая неабходнасць. І колькі б ні каштавала паліва, людзі ўсё адно будуць ездзіць на ўласных машынах. У веласіпедную альтэрнатыву верыцца слаба: не з нашым кліматам і менталітэтам. Таму ў планах развіцця гарадоў варта ўлічваць той факт, што аўтамабіляў менш не стане. Трэба глядзець у будучыню і прагназаваць развіццё нават не на гады, а на дзесяцігоддзі наперад.

**Валянцін БОЙКА.** *boika@zviazda.by*

# «САКРЭТНЫ» АБ'ЕКТ

## Чаму ў Гродне цяжка «прабіць» яго ўстаноўку

**Шлагбаумы ў дварах — тэма ў Гродне надта непапулярная. Гаварыць аб гэтым не хочуць як ведамствы, так і члены таварыстваў уласнікаў дамоў. Пры гэтым інфармацыя з розных крыніц супярэчлівая. Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца, чаму гэтая тэма амаль што засакрэчана.**

### ПАРКОЎКА — НЕ ЎЛАСНАСЦЬ!

У аддзеле архітэктуры і будаўніцтва гарвыканкама растлумачылі, што нарматыўнымі дакументамі не прадугледжана ўстаноўка агароджаў у жылых шматпавярховых забудовах. Двор — гэта месца агульнага карыстання, а не ўласнасць жыхароў. Таму і паркавацца можа любы, хто пажадае. Іншая справа — дамы павышанай камфортнасці. Там уласная паркоўка ўваходзіць у кошт кватэры, таму і аўта-месца замацавана за ўласнікам кватэры, што называецца, навечна. У астатніх выпадках трэба перагледзець праектную дакументацыю.

І ўсе ж адасобіць свой двор ад «залётных» аўто рэальна. Напрыклад, калі гэта тупіковы двор, дзе няма скразнога праезду. Альбо не хапае паркавачных месцаў для жыхароў дома.

> А між іншым, відавочныя станоўчыя факты — дворыкі, дзе стаяць шлагбаумы, акуратныя, дзіцячыя пляцоўкі пафарбаваныя, смецце не валяецца, паркоўка не забіта пад завязку.

Кожны канкрэтны выпадак разглядаецца індывідуальна. Каб атрымаць дазвол, трэба сабраць подпісы ўсіх жыхароў. Затым заказаць праектную дакументацыю, узгадніць устаноўку з Дзяржаўтаінспекцыяй, МНС, службай «хуткай дапамогі», жыллёва-камунальнай гаспадаркай, «архітэктурай». І толькі пасля 7—8 інстанцый можна атрымаць дазвол на ўстаноўку.

### ТЭРЫТОРЫЯ ПАДАЗРОНАСЦІ

На прадпрыемстве «Спецаўтагаспадарка» горада Гродна назвалі два дамы, дзе ўстаноўлены шлагбаумы.

Накіроўваюся на вуліцу Рагачэўскага, што на ўскрайку горада. Дом са шлагбаумам — самы крайні, за ім пачынаецца лясны масіў. Панэльная высотка выглядае новай і акуратнай, а двор з дзіцячай пляцоўкай — дагледжаным. На зялёным газоне высаджана дэкаратыўнае кустоўе, дом забяспечаны сістэмай відэаназірання.



Падумала — вось ён, плюс адасобленага пражывання. Паўсюдна чысціня і парадак, на паркоўцы ў абед усяго некалькі машын. Падлічыўшы, вызначыла, што на 104 кватэры прыходзіцца каля 70 паркавачных месцаў. А значыць, праблем з паркоўкай няма. Аб гэтым меркавала пачуць ад саміх жыхароў, але атрымалася наадварот: з пад'езда выйшла жанчына, якая запатрабавала тэрмінова пакінуць тэрыторыю прыватнага двара, маўляў жыхары занепакоены ўвагай да іх дома.

Неахвотна ішлі на кантакт з карэспандэнтам і ў доме па вуліцы Дзяржынскага. Дарэчы, гэты будынак, дзе ўстаноўлены шлагбаум, адзін з самых высотных у горадзе. Засяляцца жыхары пачалі гады два назад, адразу ж вырашылі заняцца агароджай. Як паведаміла старшыня таварыства, за ўстаноўку шлагбаума прагаласавалі ўсе. Але тыя, у каго няма машыны, грошай не здавалі. Збор з адной кватэры склаў 150 рублёў.

Мяркуючы па ўсім, гэты працэс вельмі нервовы для жыхароў. Асабліва калі ўлічыць, што ім могуць адмовіць у самы апошні момант.

### БАР'ЕР — НЕ ЗАГАНА

У аддзеле па зваротах грамадзян гарвыканкама між тым адзначылі, што колькасць ахвотных устанавіць шлагбаумы расце. Звяртаюцца таварыствы ўласнікаў дамоў па вуліцах Паўднёвай, Брыкеля, Дзяржынскага, Шчорса, Малышчынскай. Да ўстаноўкі шлагбаумаў мясцовыя ўлады ставяцца насцярожана. Аб гэтым сведчыць і супярэчлівасць інфармацыі.

Напрыклад, у аддзеле архітэктуры паведамілі толькі пра адзін шлагбаум, хоць іх аказалася два. А ў некаторых ведамствах, якія ўзгадняюць устаноўку, наогул не ведаюць аб іх існаванні. Па адных звестках, таварыства ўласнікаў атрымала адмову, па іншых — працэс узгаднення працягваецца.

> Мяркуючы па ўсім, гэты працэс вельмі нервовы для жыхароў. Асабліва калі ўлічыць, што ім могуць адмовіць у самы апошні момант.

А між іншым, відавочныя станоўчыя факты — дворыкі, дзе стаяць шлагбаумы, акуратныя, дзіцячыя пляцоўкі пафарбаваныя, смецце не валяецца, паркоўка не забіта пад завязку. Службы, якім неабходна праехаць, карыстаюцца спецыяльнымі GSM-модулямі, якія дазваляюць адчыніць шлагбаум пры дапамозе мабільнага тэлефона.

Начальнік участка прадпрыемства «Спецаўтагаспадарка» Дзмітрый Гарузка не бачыць праблем з пад'ездам тэхнікі. На яго погляд, справа ў іншым — цяжка атрымаць дазвол на ўстаноўку шлагбаума. Дзмітрый Гарузка прыводзіць прыклад сталіцы, дзе гэтая працэдура спрошчаная. У Гродне пакуль сітуацыя дваістая. З аднаго боку — можна, з другога — нельга. А пры такім раскладзе ўсё залежыць ад рашэння мясцовых улад.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

**У ТЭМУ**

**Вольга БАРЭЙКА, галоўны спецыяліст упраўлення архітэктуры і горадабудаўніцтва:**

— У гістарычным цэнтры горада сапраўды трэба было б абмежаваць доступ аўтамабіляў, але закон не дазваляе гэта зрабіць, бо тэрыторыя нават старых дворыкаў не з'яўляецца ўласнасцю жыхароў, і няма такога закона, які б забараніў заехаць сюды любому аўтамабілю. Для паляпшэння сітуацыі гарадскія вуліцы дубліруюць дарогі, дзе размяшчаюцца паркавачныя месцы. У горадзе нямала платных аўтастаянак, працуе паркінг. А ў дварах месцы не платныя, чаму іх можна прысвойваць?


МТБанк
Банк свежих решений

Наименование банка:

**ЗАО «МТБанк», г. Минск**

www.mtbank.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2017 г.**

*в тысячах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки. | 2017 г. | 2016 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 35 471 | 31 759 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 28 336 | 35 822 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 83 197 | 87 609 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 118 236 | 40 120 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 457 347 | 421 031 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 17 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 507 | 507 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 34 584 | 22 171 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 760 | 1 388 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 38 | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 15 862 | 25 192 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 774 355 | 665 599 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 629 | 12 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 44 867 | 66 860 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 596 070 | 469 631 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 16 405 | 38 200 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 17 613 | 8 422 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 675 584 | 583 125 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 12 306 | 12 186 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 11 382 | 9 504 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 4 303 | 4 303 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 70 780 | 56 481 |
| 30 | Всего собственный капитал | 121 | | 98 771 | 82 474 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 774 355 | 665 599 |

**ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 1 квартал 2017 года**

*в тысячах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | П-т поясн. записки | 2017 г. | 2016 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 27 990 | 28 762 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 13 056 | 15 019 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 14 934 | 13 743 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 23 179 | 15 044 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 2 243 | 2 772 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 20 936 | 12 272 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 18 | 174 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 3 652 | 6 117 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (164) | (29) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 3 057 | 6 264 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 694 | 7 453 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 19 034 | 16 614 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 857 | 1 850 |
| 15 | Прибыль(убыток) до налогообложения | 211 | | 17 122 | 15 002 |
| 16 | Расход(доход) по налогу на прибыль | 212 | | 2 747 | 1 912 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) | 2 | | 14 375 | 13 090 |

Руководитель А.К. Жишкевич

Главный бухгалтер Г. П. Лаптенок

Дата подписания 06 апреля 2017 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности №13,
выдана Национальным банком Республики Беларусь 6 мая 2013 года.
УНП 100394906

# Прыступкі Алены Алексінай

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

***— Бацькі, я так разумею, віталі такі лад жыцця?***

— Так. Маці была добрай гаспадыняй, а вось усё, што датычылася кантролю за ведамі, з'яўлялася бацькаўскім абавязкам. Ён павінен быў у канцы тыдня падпісваць дзённік. Часам, калі ў мяне мелася «чацвёрка», мог не падпісаць яго ў суботу. Казаў — падпіша, калі я адзнаку на «пяцёрку» выпраўлю. Тое, што я ўмею размаўляць, пісаць, пераконваць — гэта ў большай ступені заслуга бацькі. Ён сам многа чытаў і мяне да гэтага прывучыў. Ён яблыкаў добрых набярэ ў садзе і едзе ў Буда-Кашалёва. Яму прададуць з-пад прылаўка дэфіцытную кніжку. У доме была палічка, куды бацька кнігу клаў. Чыталі разам. Кожны раз мяне пытаў: «Да якой старонкі дайшла? Я не дайшоў — раскажы». Сёння разумею, што ён такім чынам правяраў, ці я чытала, і адначасова развіваў у мяне памяць і ўменне пераказваць, аналізаваць, абмяркоўваць. Маці вучыла ўсім жаночым справам: прыбіраць, гатаваць...


Акцябрскі сельсавет. Добраўпарадкаванне дзіцячай пляцоўкі.

***— Алена Іванаўна, бацькі настройвалі на выбар пэўнай спецыяльнасці?***

— Нам дазвалялі самім вызначыцца. Я спачатку хацела быць юрыстам. Двойчы паступала на юрыдычны ў БДУ, але конкурс быў вялікі, і калі не паступіла, пайшла працаваць туды, дзе прымалі з вясковай прапіскай: на фабрыку цацак. Дарэчы, у Гомелі побач жыла мая сястра, і мне было зручна. У цэх зборкі прынялі вучаніцай афарміцеля. Раздатчыца прывозіла цацкі, якія былі напоўнены паралонам. У іх меліся вочкі і іншая фурнітура, а мы шылам выпраўлялі форму: пыску, кіпцюрыкі, жывоцік. Таксама вычэсвалі ворс. Разрэз ззаду зашывалі ўручную. На вуха ці на лапу ставілі бірку. У мяне быў № 305. Потым кантралёр правяраў якасць...

Праўда, я зусім нядоўга была вучаніцай. Хутка сама стала інструктарам, а потым мяне выбралі сакратаром камсамольскай арганізацыі цэха, членам камітэта камсамола фабрыкі. Там я таксама прымала ўдзел ва ўсіх спаборніцтвах, конкурсах і канцэртах.


Маладзёжная акцыя ў Буда-Кашалёўскай гімназіі.

***— Гэты шлях вучнёўства, праходжанне ад ніжэйшых прыступак да вышэйшых — навошта ён патрэбны?***

— Гэта перш за ўсё выхаванне адказнасці і каманднага духу. У любым калектыве ёсць пэўны парадак, правілы і ў іх межах трэба быць адказным выканаўцам. Потым пайшла вучыцца на інжынера чыгуначнага транспарту на будаўнічы факультэт. А да таго ўжо стала кандыдатам у члены КПСС і была абрана дэпутатам райсавета Чыгуначнага раёна. Памятаю, аднойчы мяне выгналі з экзамену па начартальнай геаметрыі за тое, што спрабавала дапамагчы суседу. Пайшла на перездачу, а пасля быў партыйны сход. А я ж кандыдат у члены партыі! Выкладчык гаворыць: «Мне вельмі няёмка, што кандыдат у члены партыі так робіць!»... Увогуле ж, многіх спакус студэнцкага жыцця ў мяне не было, бо жыла ў сястры. Да таго ж, на другім курсе выйшла замуж, а праз год, у маі 1987-га, нарадзіла дачку Вольгу. Перавесціся на завочнае ці ўзяць акадэмічны бацька не даваў. Сказаў: «Няпроста будзе, але мы дапаможам». І дапамагалі. Мы жылі ў сястры дзвюма сем'ямі. Сакурснікі дапамагалі канспекты пісаць. Бацька пасля работы ў лакаматыўным дэпо ішоў да нас. Я пакідала на яго дачку і бегла на заняткі. Дапамагалі і мама, і свякроў, і суседкі... Мая дачка — усенароднае дзіця, якое мы расцілі разам.

***— Вы ж ледзь не пакінулі Беларусь у пошуках пастаяннага жылля?***

— Было. Сапраўды, пытанне жылля, асабліва для сямейных, было вельмі актуальным. Пасля трэцяга курса на практыку нас запрасілі ў Томск і паабяцалі, што калі прыедзем туды па размеркаванні — дадуць жыллошчу. Практыка праходзіла ў тайзе. Мы разам з геолагамі распрацоўвалі будучую чыгуначную трасу. Гэта была цудоўная магчымасць пажыць далёка ад цывілізацыі, сутыкнуцца з людзьмі розных характараў, праверыць сябе. Гатавалі ежу на вогнішчы, мылі адзенне ў Енісеі. Такая своеасаблівая школа выжывання. Але на месцы зразумела: жыллё нам ніхто не збіраецца выдзяляць. Таму са свабодным размеркаваннем вярнулася ў Буда-Кашалёва, дзе нікому ў будаўнічых арганізацыях не патрэбна была маладая жанчына з дзіцем на руках. Урэшце суседка параіла папрасіцца ў аддзел сацзабеспячэння райвыканкама. Іншага варыянта ў мяне не было. Начальнік Таццяна Мікалаеўна Зянкевіч сказала: спадабаецца працаваць з людзьмі — усё атрымаецца. Мне даручылі кансультаваць і прызначаць пенсію людзям з некалькіх сельсаветаў. Праз пяць гадоў стала галоўным спецыялістам, яшчэ пяць была загадчыцай аддзела, а потым стала начальнікам упраўлення. У 2004 годзе мне прапанавалі пасаду намесніка старшыні райвыканкама, а ў 2007-м выбралі старшынёй райсавета. Вось так і здарылася, што прайшла літаральна кожную прыступку кар'ернай лесвіцы. І кожная дала пэўны вопыт, навыкі, веды...

***— Як вашы лідарскія якасці дапамагаюць у сённяшняй рабоце?***

— Мая работа звязана ў першую чаргу з людзьмі, таму, канешне, актыўнасць, мэтанакіраванасць, а таксама жаданне працаваць над сабой і ў камандзе, — гэта ўсё дапамагае будаваць стасункі і вырашаць праблемы. Часта пытанні гэта не глабальныя, але вельмі важныя для канкрэтнага чалавека: стан дарог, водазабеспячэнне, рамонт жылля, сямейныя спрэчкі, вулічнае асвятленне, канфліктныя сітуацыі па аплаце працы... Важна праводзіць жывы дыялог і мець зваротную сувязь. Таму, акрамя сустрэч і прыёмаў, мы пастаянна ажыццяўляем выезды па месцы жыхарства і ў працоўныя калектывы. Пры раённым Савеце створана маніторынгавая група з дэпутатаў, якія па сваёй прафесійнай дзейнасці займаюцца эканомікай. З імі штоквартальна выязджаем на адно з праблемных прадпрыемстваў, дзе вывучаем усе эканамічныя складнікі, наведваем структурныя падраздзяленні і з людзьмі абмяркоўваем усё тое, што іх хвалюе.

***— Алена Іванаўна, а калі трэба не быць лідарам?***

— Канешне, дома. З дачкой мы вялікія сяброўкі, хоць у кожнай ёсць сваё жыццё, свая прастора і свае сакрэты. У асобных выпадках бяру ініцыятыву і на чымсьці настойваю. Але ж бывае, што яна мне кажа: матуля, ты не на працы. Дачка выказвае часам зусім іншы погляд на нейкія рэчы. Прыслухоўваюся і вельмі многаму ў яе вучуся. Але ж і правяраю кожнае меркаванне. Калі працуеш з людзьмі, пастаянна трэба быць у пошуку.

***— Адкуль у вас, «дзяўчынкі з вёскі», такі бездакорны густ?..***

— Напэўна, гэта ад сям'і. Так, у нас лішніх грошай не было, бацькі размяркоўвалі свой заробак, але ж клапаціліся і пра тое, каб мы былі акуратна апранутыя. Я даношвала адзенне сястры. Потым, калі сястра займела сваю сям'ю, бацькі мяне, малодшую, імкнуліся песціць, куплялі адзенне да 1 верасня і да Вялікадня. На чыгунцы давалі бясплатныя білеты, і тата мяне браў з сабой у Кіеў, Мінск, Маскву. Мы ехалі па грэчку, селядцы і каўбасу, але ж абавязкова былі і на экскурсіях. Да таго ж, я заўсёды звяртала ўвагу на тое, як хто апрануты... Пазней, у 90-я быў перыяд, калі ўсе ездзілі ў Польшчу і Расію нешта прадаваць і купляць. Ну і я ездзіла... І гэта быў вопыт таксама.

***— Ці ёсць у вас нейкі дэвіз па жыцці?***

— Калісьці бацька сказаў: будуць розныя сітуацыі, але заўсёды імкніся дзейнічаць згодна з сумленнем. Калі заканчвала інстытут, навуковы кіраўнік Наталля Даўгялёнак раіла: «Заўсёды кажы: ведаю, умею, змагу!» Калі здараецца нейкая няўдача, загадваю сабе: падніміся і ідзі! Жыццё ж працягваецца. Што датычыцца людзей, з якімі працую, для мяне заўжды важна спачатку навучыць, паказаць, а потым патрабаваць. Давер у працы, у жыцці, у стасунках — вельмі важны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*


**РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после вторых несостоявшихся торгов по продаже автотранспортного средства – легкового автомобиля SKODA OKTAVIA KOMBI, принадлежащего Республиканскому дочернему унитарному предприятию «Белоруснефть-Транс» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (без НДС согл. п.п. 2.3 п. 2 ст. 93 НК РБ) | Задаток, рублей (без НДС согл. п.п. 2.3 п.2 ст. 93 НК РБ) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль SKODA OKTAVIA KOMBI, инв. №11**, временный регистрационный знак 2ВН 9706, выдан 30.10.2015 г., год выпуска автомобиля – 2011, цвет серый металлик, двигатель 1,6 TD, полный привод. Номер кузова (рамы): TMBKT41Z6B2127119. Тип: легковой универсал. Автомобиль находится в аварийном состоянии (имеет технические повреждения в результате фронтального удара при ДТП). Местонахождение предмета торгов: Гомельская обл., г. Мозырь-11, промзона «Михалки», транспортный участок | **4 672,89** | **233,64** |

**Шаг аукциона – 5%.**
**Аукцион состоится 11 мая 2017 г.**
**по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23. Начало в 10.00**

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул.Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 6 мая 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **11 мая 2017 г.**

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. №609.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%.

**К заявлению на участие в аукционе прилагаются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора торгов, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или трудовой договор (контракт), или иные документы в соответствии с законодательством). В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 26 апреля 2017 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), будет засчитан в счет окончательной стоимости предмета торгов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан:** в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется перед началом аукциона; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов; в течение 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет десять базовых величин за каждый случай нарушения.

*Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газетах «Сельская газета» («Белорусская Нива») №95 от 18.08.2016 г., «Звязда» №37 от 23.02.2017 г.*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 32-46-47; 32-00-71 ● www.gino.by ● e-mail: info@gino.by**

**Продавец: Государственное предприятие «Белоруснефть-Транс», г. Гомель, ул. Книжная, 15Б. ☎ 8 (0236) 33-77-43, 8 (033) 365-62-60**



ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 25.05.2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10**

| № п/п | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| **Адрес земельного участка** | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 13, кадастровый номер 623288016101000064 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 15А, кадастровый номер 623288001601000092 | д. Коммуна, ул. Садовая, 4А, кадастровый номер 623288008101000033 |
| **Площадь земельного участка** | 0,1285 га | 0,1369 га | 0,2339 га |
| **Наименование инженерных сетей** | | подъездные пути удовлетворительные | подъездные пути удовлетворительные |
| **Начальная цена (бел. руб.)** | 2480 руб. 85 коп. | 2158 руб. 98 коп. | 3871 руб. 45 коп. |
| **Задаток (бел. руб.)** | 496 руб. 17 коп. | 431 руб. 80 коп. | 774 руб. 29 коп. |
| **Расходы по документации (бел. руб.)** | 1326 руб. 02 коп. | 1356 руб. 96 коп. | 1435 руб. 37 коп. |

Задаток перечисляется на р/счет 3600619171104 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, УНП 600537220, ОКПО 04431642 Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится 25.05.2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 20.05.2017 г. (последний день подачи заявления – 19.05.2017 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99**

СІТУАЦЫЯ

# ЮШКА ПА-ЛЮБАНСКУ

## Мясцовы рыбакамбінат у пошуку дадатковых даходаў

**ЛЕТАСЬ мы пісалі аб цяжкім фінансава-эканамічным становішчы ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Рыбакамбінат «Любань». У 2012-м тут пачалося будаўніцтва цэха па перапрацоўцы рыбных кансерваў, які планавалася ўвесці ў дзеянне ў 2015-м. Але працэс прыпыніўся. Справа ў тым, што былое кіраўніцтва прадпрыемства закупіла старое абсталяванне ў Калінінградзе, якое прызначалася для перапрацоўкі буйной марской і акіянічнай рыбы, а не іх сародзічаў сямейства карпавых. Больш за тое, розныя агрэгаты лініі не стыкаваліся паміж сабой. І асобныя аперацыі даводзілася выконваць уручную. Карэспандэнт наведала камбінат, каб высветліць, якія зрухі тут адбыліся і калі вытворцы парадуюць спажыўцоў далікатэсамі.**

— Мы паўгода займаліся пытаннямі замены канвеера, прайшлі некалькі экспертыз і даказалі пастаўшчыку, што маем рацыю, — расказаў **дырэктар прадпрыемства Валерый ГОРМАШ**, які прызначаны на пасаду год таму. — З гэтай прычыны адкрыццё новай вытворчасці зацягнулася. У пачатку сакавіка было пастаўлена новае абсталяванне ўзамен старога. Цяпер яно манціруецца.

Разам з тым на камбінаце выпусцілі пробную партыю кансерваў двух відаў: з карпа і таўсталобіка ў алеі — усяго 1000 бляшанак. Працэс першаснай апрацоўкі рыбы ішоў уручную, а яе ўкладка — механічным шляхам. На працягу трох месяцаў кансервы будуць знаходзіцца на выспяванні. Пасля адпаведнай экспертызы і адсутнасці заўваг пачнецца прамысловы выпуск новай прадукцыі. З цягам часу плануецца вырабляць кансервы з карпа, таўсталобіка, белага амура, шчупака ва ўласным саку, жэле, таматным соусе. У далейшым лінейка рыбных кансерваў будзе даведзена да 10. А ў больш аддаленай перспектыве мяркуецца вырабляць да 20 відаў кансерваў (10 млн бляшанак штогод). У хуткім часе з'явіцца і брэнд для кансерваў. Усяго ў новым цэху будзе перапрацоўвацца 3,5 тыс. тон рыбы ў год, у тым ліку 2,5 тыс. тон уласнай і айчынных рыбгасаў і 1 тыс. тон марской рыбы.

— Праектная магутнасць цэха 20 тыс. бляшанак у змену. «Пачнём з 5—10 тысяч, паколькі для нас пакуль актуальны пошук рынкаў збыту, напрацоўка кліенцкай базы. Перш за ўсё будзем насычаць айчынны рынак. Гандлёвыя сеткі ўжо цяпер просяць паглядзець, паспрабаваць на продаж нашы кансервы. Плануецца пастаўляць прадукцыю ў Расійскую Федэрацыю: Вялікія Лукі, Ноўгарад. Нашы спецыялісты выязджаюць туды для заключэння дагавораў, прасоўвання прадукцыі, — канстатаваў Валерый Гормаш.

Валерый Іванавіч адзначыў, што ўстаноўка новай лініі цягне за сабой дадатковыя затраты. З самага пачатку ў праекце не прадугледжаны цэлы шэраг тэхналагічных момантаў. Паралельна з работамі даводзіцца ўносіць у яго змяненні і дапаўненні. Некаторае абсталяванне састарэла, трэба купляць новае. Даводзіцца выпраўляць і будаўнічыя хібы: вымушаны былі перарабляць падлогу, якая не мела сцёку вады, плінтусы, пандусы на вуліцы, ізаляцыю на трубах. Выпраўленне недахопаў патрабуе дадатковых укладанняў. Усяго на гэта пайшло 550 тыс. рублёў уласных сродкаў. Каб залатаць усе дзіркі, неабходна яшчэ 150 тыс. рублёў.

— У першую чаргу імкнёмся разлічыцца па заработнай плаце, падатках, з пенсійным фондам. Акрамя таго, трэба купляць паліва, запчасткі да машын, новы пасадачны матэрыял, корм для рыбы. А тое, што застаецца, ідзе на ліквідацыю недахопаў, — кажа дырэктар. — На ўліку ў нас кожны рубель.



У сувязі з няпростым фінансавым становішчам пачалі шукаць дадатковыя даходы. У прыватнасці, гатаваць рыбную юшку ў палявой кухні на 140 літраў. Яе смак ацанілі мясцовыя жыхары — прадукцыя па 1,5 рубля за літр ідзе на ўра. За выручку, што набягае за месяц, можна купіць два бензавозы паліва.

Вытворчасць, увядзенне якой у дзеянне зацягнулася, плануюць акупіць за восем гадоў. Для гэтага робіцца ўсё неабходнае. Летась павялічылі вылаў рыбы ў два разы. Пры плане 550 тон узялі яе 1360 тон, у тым ліку 1109 тон таварнай. Акрамя камбікорму, у асноўным закуплялі мясцовыя віды кармоў: брагу і бульбяную мязгу — адходы спіртавой і крухмальнай вытворчасці, у калгасах набывалі зерне і яго адходы, арганіку. Усё гэта ў комплексе дало добры ўраджай рыбы і дазволіла знізіць яе сабекошт. Сёлета на камбінаце разлічваюць выйсці на ўлоў у 2 тыс. тон, своечасова правялі зарыбленне, назапашваюць кармы, імкнуцца, каб рыба была смачнай і даступнай па цане для спажыўцоў.

Гаспадарка ўяўляе сабой 49 сажалак, якія раскінуліся на плошчы больш як 2 тыс. гектараў. Тут у асноўным вырошчваецца карп. Акрамя таго, ёсць сом, белы амур і таўсталобік. У 2010 годзе на заводзе адкрылі цэх па перапрацоўцы, дзе вырабляецца філе свежай рыбы ў вакуумнай упакоўцы, а таксама вэнджаная і вяленая рыба, наборы для юшкі, шашлык у пластыкавых вядзерцах, прэсервы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*


**Организатор торгов, ликвидатор ООО «Производственно-торговая компания «Мастервуд» – Никитина Алеся Федоровна, действующая на основании Протокола внеочередного собрания участников ООО «ПТК «Мастервуд» от 03.06.2016 г., сообщает о проведении торгов по продаже имущества, а именно:**

Предмет торгов:

| № лота | Наименование лота | Кол-во, ед. | Начальная цена за 1 ед. лота в бел. руб. | Шаг торгов 5% | Задаток 10% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автотранспортное средство Renaut Masscot. 2007 г.в., VIN VF354ANA000037378 | 1 | 14 898,0 | 744,90 | 1489,8 |
| 2 | Станок для шлифовки стекла GTC-011L | 1 | 1165,2 | 58,26 | 116,52 |
| 3 | Станок торцовочный 2-пильный мод. TR2ACE | 1 | 11 533,2 | 576,66 | 1153,32 |
| 4 | Станок универсальный фрезерный FUS-22 | 1 | 5377,2 | 268,86 | 537,72 |
| 5 | Станок форматно-раскроечный круглопил мод. Actra400CE | 1 | 15 233,4 | 716,67 | 1523,34 |
| 6 | Пылесос CTL26E | 2 | 360,6 | 18,03 | 36,06 |
| 7 | Кромкооблицовочный станок BRANDT Optimal KTD 72 | 1 | 2436,0 | 121,8 | 243,6 |

Продавец – ООО «ПТК «Мастервуд». Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.
До подачи заявления на участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичной форме по следующим платежным реквизитам: ООО «ПТК «Мастервуд», р/с 3012212717007, вид валюты 933 (белорусские рубли), код банка 270 в ЗАО «Альфа-банк», УНП 191605354.
Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 03 мая 2017 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом 46, офис 5.
Окончание приема заявок на участие в торгах прекращается за 2 дня до даты, на которую назначено проведение торгов.
Задаток должен поступить на указанный счет Продавца не позднее 03 мая 2017 года.
Торги состоятся 05 мая 2017 в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом 46, офис 5.
Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в объявлении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:
– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов;
– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.
Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов.
Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов.
Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Результаты торгов оглашаются в день проведения торгов.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
С дополнительной информацией о предмете торгов можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом 46, офис 5. Тел.: (029) 645 19 47



**Извещение об открытом аукционе по продаже**

**имущества совместного общества с ограниченной ответственностью «Экопромэнерго» 26 мая 2017 года**

| Вид аукциона | Открытый с условиями* |
|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий и сооружений: главный производственный корпус с инвентарным номером 400/С-53750 площадью 3364,4 кв. м, здание бродильного отделения, купажного отделения, строительного участка, склада тары с инвентарным номером 400/С-43166 площадью 1157,0 кв. м, здание цеха разлива пива и склада готовой продукции с инвентарным номером 400/С-43167 площадью 1631,7 кв. м, здание цеха напитков с инвентарным номером 400/С-43168 площадью 469,7 кв. м, весовая с инвентарным номером 400/С-49274 площадью 63,0 кв. м, здание административно-хозяйственное с инвентарным номером 400/С-49169 площадью 191,8 кв. м, трансформаторная подстанция с инвентарным номером 400/С-43207 площадью 49,0 кв. м, магазин с инвентарным номером 400/С-43211 площадью 38,2 кв. м, ЦКТ с инвентарным номером 400/С-51792 площадью 270,5 кв. м, склад с инвентарным номером 400/С-49272 площадью 28,5 кв. м, склад с инвентарным номером 400/С-51791 площадью 12,7 кв. м, одноэтажное кирпичное сооружение КНС с инвентарным номером 400/С-43165 площадью 4,5 кв. м, градирня с инвентарным номером 400/С-43209 площадью 39,5 кв. м, артскважина с насосной станцией с инвентарным номером 400/С-43171 площадью 13,1 кв. м и другие здания, передаточные устройства и сооружения, предназначенные для обслуживания объекта историко-культурной ценности «Комплекс пивоваренного завода» |
| Начальная цена продажи | **1 530 570,14 рубля (с учетом НДС 20%)** |
| Кадастровый номер земельного участка и вид вещного права | **440100000002005526,** право постоянного пользования |
| Месторасположение земельного участка | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Заводская, д. 2** |
| Размер земельного участка | **0,8155 га** |
| Продавец | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Экопромэнерго», г. Минск, а/я 98, д. 4, тел. +375293172332 |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | **26 мая 2017 года** |
| Время проведения аукциона | **12.00** |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| Дата и время начала приема документов | 26 апреля 2017 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 22 мая 2017 года 17.00 |
| Сумма задатка | **127 547,51 рубля** |
| Шаг аукциона | 5% |

* В договоре купли-продажи будут предусмотрены следующие условия:
-подписание покупателем охранного обязательства на материальную недвижимую историко-культурную ценность в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности на объект историко-культурной ценности «Комплекс пивоваренного завода»;
- разработка покупателем проектно-сметной документации на проведение капитального ремонта и (или) реконструкции объекта историко-культурной ценности «Комплекс пивоваренного завода» под объект общественного назначения в течение двух лет со дня заключения договора купли-продажи;
- проведение капитального ремонта и (или) реконструкции объекта историко-культурной ценности «Комплекс пивоваренного завода» и ввод его в эксплуатацию в сроки, определенные проектно-сметной документацией;
- ответственность покупателя за невыполнение условий продажи (штрафные санкции в размере 1000 базовых величин, установленных законодательством на момент выявления нарушений, и за каждые последующие шесть месяцев нарушения сроков выполнения условий – 500 базовых величин).
Контроль за выполнением условий договора купли-продажи осуществляет Гродненский городской исполнительный комитет.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», код 752, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости»;
**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: www.grodno.gov.by

# І ПОПЫТ ЁСЦЬ, І ПРАПАНОВА

## Як у будынку былой майстэрні ўзнік невялікі вясковы бізнес

**КОЛЬКІ зараз у вёсках можна сустрэць пустуючых будынкаў школ, клубаў, вытворчых памяшканняў! Апошнім часам у спіс актыўна дабаўляюцца былыя лазні. Без гаспадара ўсё гэта пастулова разбураецца, зарастае бур'янам і становіцца галаўным болем для мясцовай улады. Таму прыклады, калі пустуючыя аб'екты набываюць новае жыццё, усяляюць пэўны аптымізм — бо даюць надзею на далейшую перспектыву вёскі. Адзін з такіх прыкладаў удалося пабачыць у глыбі Палесся, у вёсцы Літоўск Драгічынскага раёна.**

Да нядаўняга часу ў Літоўску размяшчалася рамонтна-механічная майстэрня сельгаспрадпрыемства «Закозельскі». Але, як цяпер нярэдка бывае, у выніку рэарганізацый, узбуйненняў, аптымізацый аб'ект трапіў пад скарачэнне, а капітальная пабудова засталася. Наяўнасць трывалага будынка і падштурхнула Аляксандра Галабурду распачаць тут свой бізнес. Аляксандр — не заезджы інвестар, нават не прадпрымальнік са стажам. Ён жыхар суседняга Закозеля, а нарадзіўся і вырас у Літоўску. Да нядаўняга часу працаваў у мясцовай гаспадарцы механізатарам, вадзіцелем, на іншых участках. А калі памяшканне майстэрні вызвалілася, прылічылі ўсё з жонкай-бухгалтарам, склалі свой бізнес-план і вырашылі рызыкнуць.

Будынак Аляксандр Аляксандравіч купіў у 2014 годзе за 120 мільёнаў рублёў і адкрыў у ім пілараму. Ёсць ужо неабходная тэхніка, абсталяванне — справа ладзіцца. Першыя тры гады паказалі, што попыт на паслугі па распілоўцы драўніны ёсць. З рэгістрацыяй новага вясковага прадпрыемства «Літоўск-Прам» сем чалавек атрымалі работу.



Цясляр Аляксандр ЖАРКО.

> Новы вясковы прадпрымальнік мае намер развіваць сваю вытворчасць. Ужо сёлета ён купіў будынак былой лазні за адну базавую велічыню — там паступова будзе абсталяваны цэх для сушкі драўніны.



Аснова для альтанкі.

— Драўніну бяром у лесе, — расказвае Аляксандр Галабурда. — Мы аказваем паслугі лясгасу па распрацоўцы лясных дзялянак. Наша брыгада нарыхтоўвае лес, а лясгас разлічваецца часткова грашыма, а часткова драўнінай. Для работы ў лесе ёсць трактар, гідраманіпулятар, усе неабходныя прыстасаванні. Такім чынам у парадку ўзаемаразліку мы атрымліваем дзелавую драўніну. Распілоўваем яе на сваёй вытворчай базе, атрымліваем будаўнічы матэрыял. 80 працэнтаў нашых спажыўцоў — гэта фізічныя асобы, забудоўшчыкі прыватнага жылля.

